PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 19 (2452) Год XLVIII | Беласток, 11 мая 2003 г. | Цана 2,00 зл.

Не асіметрычнасць, а ўзаемнасць

Віталь Луба

1 ліпень не за гарамі, а канкрэтных вырашэнняў наконт візавага рэжыму паміж Польшчай і Беларуссю пакуль няма. Усё яшчэ вядуцца кансультацыі па пытанні ўзаемных паездак грамадзян абедзвюх краін.

„Візавы рэжым — гэта адна з найбольш складаных балючых для абодвух бакоў праблем", — сказаў міністр замежных спраў Польшчы Владзімеж Цімашэвіч у размове з Сямёнам Букчыным для „Белорусской деловой газеты". Кіраўнік знешнепалітычнага ведамства напомніў, што ўвядзенне віз не з'яўляецца нейкім валюнтарысцкім рашэннем з боку Польшчы, а толькі звязана яно з выкананнем абавязацельстваў перад Еўрапейскім Саюзам. Польскі бок хоча зрабіць усё, каб грамадзяне абедзвюх краін у як найменшай ступені адчулі нявыгаду ад новаўвядзення. Па гэтай прычыне беларускаму боку, так як і Украіне, быў запрапанаваны прынцып асіметрычнасці, які заключаецца ў тым, што Польшча ўводзіць бясплатныя візы, а Беларусь дазваляе польскім грамадзянам бязвізавы ўезд на сваю тэрыторыю. З пункту гледжання звычайнага грамадзяніна прапанаваныя ўмовы вельмі выгадныя.

15 і 16 красавіка ў Мінску адбыўся чарговы раунд беларуска-польскіх кансультацый па абмеркаванні ўмоў будучага парадку ўзаемных паездак грамадзян абедзвюх краін. Беларусь, так як і Расія, не прыхілілася да прапанаванага прынцыпу асіметрычнасці, застаючыся на аснове ўзаемнасці. Дзень пазней у Маскве адбыліся беларуска-расійскія консульскія кансультацыі, у ходзе якіх узгадняліся падыходы да візавай палітыкі ў адносінах да краін-удзельніц Шэнгенскага пагаднення.

Канчатковы тэкст пагадненняў паміж Польшчай і ўсходнімі суседкамі ўсё яшчэ дапрацоўваецца. Польскі бок намаўляе беларускіх і расійскіх партнёраў зрабіць працэдуру атрымання візы магчыма найменш складанай, каб такім чынам мінімізіраваць паслядоўнасці ўвядзення візавога рэжыму (Украіна згадзілася на прыцып асіметрычнасці). З вынікаў кансультацый у Мінску можна ўжо гаварыць аб важнейшых дамоўленасцях. Напрыклад, аб бясплатных візах шырокім катэгорыям грамадзян. Да іх адносяцца асобы да 16 і пасля 65 гадоў, удзельнікі навуковых, спартыўных і культурных мерапрыемстваў, студэнты, настаўнікі і выкладчыкі, якія наведваюць суседнюю краіну ў рамках абмену. Права на бясплатную візу атрымаюць непрацаздольныя інваліды і спадарожнічаючыя ім асобы, грамадзяне, якія наведваюць магілы сваіх блізкіх.

[працяг ☞ 2]

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Гімназісты з Еўрапейскага школьнага клуба

Гарадоцкая чыгунка ў Еўрасаюз

Ганна Кандрацюк

У Гарадку асцярожна выказваюцца пра Еўрасаюз.

— Jestem... ani za, ani przeciw, — адказвалі многія настаўнікі і гімназісты.

Паводле апытальніка, які правёў Еўрапейскі школьны клуб — палова гімназістаў хацела б стаць грамадзянамі Еўрасаюза, другая палова — супраць далучэння.

— Бо і так нічога не зменіцца, — паўтараюць еўраскептыкі.

З дапамогай вучням і грамадству выйшаў Еўрапейскі школьны клуб, які дзейнічае ў Гарадоцкай гімназіі.

— Хочам інфармаваць пра Еўрасаюз, пра яго добрыя і дрэнныя бакі. Наша сустрэча не мае нічога супольнага з прапагандай і агітацыяй, — кажа Аляксандр Карпюк, апякун клуба.

15 красавіка г.г. наладзілі тут сустрэчу з экспертамі і еўрапрактыкамі. Разам з моладдзю выслухалі іх многія настаўнікі і мясцовая эліта.

Людзі паўтараюць міфы

— Найгорш перакананаць земляробаў, — кажа Каміль Маркевіч з III „д" класа гімназіі. Каміль дзейнічае ў школьным клубе і хвалюецца за іншых. — Людзі паўтараюць міфы што Еўропа забярэ нам працу, чужаземцы выкупяць зямлю, а на нашыя мірныя вёскі і мястэчкі нахлыне зло з Захаду. Тым часам ніхто ўголас не скажа: „ А што будзе, калі не ўступім у Еўрасаюз?"

Пётр Філіпчук з першага класа гімназіі падтрымоўвае думку Каміля:

— Калі ўвойдзем у Еўрасаюз, будзем вымушаны падцягнуцца ў сельскай гаспадарцы і ў прамысловасці. Польшча стане больш сучаснай і цывілізаванай краінай. Мы будзем свабодна падарожнічаць па свеце.

— Думаю, што зменяцца адносіны да вывучання англійскай мовы, — кажа Моніка Мурашкоўская. Пасля гімназіі Моніка збіраецца ў ліцэй у Беластоку.

— Як цудоўна мець магчымасць штудзіраваць, напрыклад, у Лондане, — задумоўваецца ўголас Моніка.

Усе мае субяседнікі хочуць жыць у большым горадзе, чым Гарадок.

— Бо ў нас і так нічога ўжо не зменіцца, — кажа Наталля Несцярчук.

Важная якасць

— Не бойцеся чужаземцаў і ўсякіх міфаў, — супакойваў сабраных Уладзімір Лукошык, вытворца малака, якога лічаць ужо еўрапейскім селянінам.

— Нашай зямлі ніхто не кінецца купляць. Раз, што зямля слабая, ды і тэхналогія прымітыўная. Заходні фермер уцячэ пасля тыдня гаспадарання на маіх машынах, бо мы працуем на ломе.

З другога боку, жыхары вёсак за ніякія грошы не прададуць сваіх гаспадарак, бо гэта адзіны спосаб на жыццё.

Міфам ёсць погляд, што будзем вымушаны купляць заходнія тавары. Мы, як бедны рынак, вымушаны купляць свае танныя вырабы. Падумайце самі — ці нехта купіць дацкі хлеб за пятнаццаць злотых, калі спажыўцу прапануюць свой за два злоты, прытым не горшай якасці. Сучасны селянін, каб быць рэнтабельным, мусіць прадукаваць танна і многа. А асноўная справа еўрапейскай канкурэнцыі — якасць прадукта.

Уладзімір Лукошык намаўляў моладзь пабываць і вучыцца ў Еўропе.

— За мяжой чалавек мацуе характар,

[працяг ☞ 3]

Душой і сэрцам за беларускую справу ☞ 3

Вясною 1956 года пісьманосец прынёс у нашу хату першы нумар „Нівы". Я быў па-святочнаму захоплены, быццам прадчуваючы, што неўзабаве „Ніва" стане мне найбольшым другам і настаўнікам. Скора стаў я пасылаць свае допісы, якія траплялі на старонкі „Нівы"; і так вядзецца па сённяшні дзень.

Беларуская дзяржаўнасць — эканамічныя перспектывы ☞ 4

З вялікім энтузіязмам пра планаваную інтэграцыю гаварыла Надзежда Місарэвіч, выкладчык міжнароднага права Гродзенскага універсітэта. Заклапочанасць вучонай выклікалі толькі юрыдычныя абумоўленасці, як, напрыклад, мела б звацца такая дзяржава, якія мець сімвалы, які гімн.

Каляпасхальныя назіранні ☞ 4

У Вялікую суботу абабегла некаторыя агенцтвы вестка, перададзеная на інтэрнэтавых старонках ізраільскіх узброеных сіл, быццам бы Садам Гусейн разам з двума сынамі і блізка трымастамі найбліжэйшымі супрацоўнікамі і аховай скрыўся ў Беларусі. Я пільна прыслухоўваўся весткам з „Навасцей", мінскім навінам у тэлебачанні. Ніякага абвяржэння не было.

Жывое беларускае слова ☞ 8

У дэкламатарскім конкурсе першае месца занялі вучаніцы Бельскага беллітцэя Эмілія Шымчук і Кацярына Нікіцюк. Другое месца занялі Малгажата Карпюк з Гайнаўкі і Міраслава Леанюк з Бельска. Трэцімі месцамі надзялілі Дароту Нікалаюк з Бельска і Дануту Шпілько з Гайнаўкі. Вылучэнні атрымалі Анна Ляшчук з Гайнаўкі і Анна Паўлючук з Бельска.

Мая маленькая радзіма ☞ 9

Вёска Вычулкі, што ўшчыльную прытулілася да мяжы з Беларуссю, — месца, дзе нарадзілася я, дзе годна жылі мае продкі, дзе многія з іх знайшлі свой апошні прытулак. Часта чула ад мамы настальгічныя аповеды аб тутэйшых мясцінах і аб людзях, што жывуць тут, — суседзях, сваяках, сябрах.

Лічылася выдатніцай ☞ 10

У 1931 годзе мяне паслалі ў школу. У Сасінах вучылася. Як была ў другім класе, дык на заробак да Мэсенга ў Быстрэ хадзіла. Працавала я ў полі, палола агародніну ды капала бульбу. За дзень працы плацілі восемдзесят грошаў. За гэтыя грошы можна было купіць метр крэтонавага палатна.

9 770546 196000

Беларусь — беларусы

Беларускі дзень у Рыжскім музеі

13 красавіка Латвійскае таварыства беларускай культуры „Сьвітанак" у самым цэнтры Старой Рыгі — Доме Менцэндорфа — ладзіла дзень беларускай культуры. Дом Менцэндорфа — гэта дом-музей багатага рыжаніна, які знаходзіцца ў прыгожым трохпавярховым будынку XVIII стагоддзя, назву мае ад прозвішча апошняга ўладальніка з пачатку мінулага стагоддзя. Ініцыятарамі правядзення свята выступілі сённяшнія гаспадары Дома Менцэндорфа — супрацоўнікі музея. Кіраўніцтва ЛТБК „Сьвітанак" заўсёды з радасцю адгукаецца на падобныя прапановы, бо яны даюць цудоўную магчымасць чарговы раз нагадаць аб нашай беларускай прысутнасці ў Рызе, магчымасць прапагандаваць нашую непаўторную, мілагучную мову, песні, традыцыі, багатую культурную спадчыну. На гэты раз „сьвітанкаўцы" падрыхтавалі дзве выставы: экспазіцыю беларускіх кніг і выставу вырабаў беларускіх майстроў. Беларуская народная творчасць была прадстаўленая вырабамі з лазы, саломкі, дрэва, керамікі, вышыванкамі і карункамі. Асаблівую цікавасць наведвальнікаў выклікалі нашыя цудоўныя ручнікі, паясы, коўдры, посцілкі, вытканыя ў мінулым стагоддзі матулямі і бабулямі рыжскіх беларусаў, захаваныя для нашчадкаў. Сярод беларускіх кніг можна было ўбачыць даволі рэдкія і каштоўныя, напрыклад, факсімільнае ўзнаўленне Бібліі, выдадзенай Францыскам Скарынаю ў 1517-1519 гадах у трох тамах, прыгожыя альбомныя выданні, розныя кнігі з аўтографамі беларускіх паэтаў і пісьменнікаў з прыватных калекцый арганізатараў выставы. Частку сувеніраў і кніг для выстаў арганізатарам свята далі для паказу ў музеі дыпламаты Пасольства Рэспублікі Беларусь.

Пачалося свята знаёмствам публікі з гісторыяй існавання беларусаў на тэрыторыі сучаснай Латвіі, з гісторыяй беларуска-латышскіх сувязей. Аб гэтым, а таксама аб сучасным жыцці нашае дыяспары, дзейнасці беларускіх суполак у Латвіі, працы беларускай школы ў Рызе распавядалі аўтарка гэтых радкоў, старшыня Аб'яднання мастакоў-беларусаў Балтыі „Маю гонар" Вячка Целеш, аўтарка кнігі „Беларусы ў Латвіі" прафесар Латвійскага універсітэта Ілга Апінэ, рэдактар газеты „Прамень" Алесь Карповіч. Аб важнасці латышска-беларускіх культурных сувязей і неабходнасці іх пашырэння выказаліся саветнік па нацыянальных пытаннях прэзідэнта Латвійскай Рэспублікі Ольгерт Тыпанс і першы сакратар Пасольства РБ у Латвіі Дзмітрый Шкурдзь, а старшыня Асацыяцыі нацыянальных культурных таварыстваў Латвіі Рафі Хараджанян адзначыў, што ЛТБК „Сьвітанак" з'яўляецца зараз адным з найактыўнейшых таварыстваў, якія ўваходзяць у асацыяцыю.

Адна з частак свята была прысвечана беларускай кухні. Акрамя „тэарэтычнага" знаёмства з своеасаблівасцямі і традыцыямі нашай кухні, гасцей чакала дэманстрацыя прыгатавання беларускіх дранікаў на старажытнай печы ў музеі, усіх прысутных таксама частавалі загадзя прыгатаванымі Таісіяй Бачкаровай дранікамі са смятанаю, цыбулькаю, шкварачкамі, рознымі поліўкамі. А потым больш як дзве гадзіны працягваўся канцэрт. Сучасныя і народныя беларускія песні спявалі дзяўчаты з гурта „Вавёрачка" Рыжскай беларускай асноўнай школы, спявачкі Ганна Крупская, Ілона Варатнікова, вакальны гурт таварыства „Сьвітанак" разам з салісткамі Аляксандрай Ларыёнавай і Галінай Уласенка. Вельмі цікавою была спецыяльная экскурсія па шматлікіх пакоях музея, арганізаваная гаспадарамі для ўдзельнікаў канцэрта і арганізатараў свята.

Таццяна Казак,
старшыня ЛТБК „Сьвітанак"

Беларускія журналісты зноў узнагароджаны

Юры Каліна і Мікола Ваўранюк, журналісты Беластоцкага аддзялення Польскага тэлебачання — лаўрэаты IV Міжнародных дзён дакументальнага фільму „Раздарожжы Еўропы", арганізаваных у Любліне.

Журы пад кірункам Анджэя Бжазоўскага прысвоіла другое месца Юрыю Каліну за дакумент „Пагоня за праўдай". Рэпартаж расказвае пра зняволенне журналістаў гродзенскай „Пагоні" Міколы Маркевіча і Паўла Мажэйкі. Гісторыя журналістаў прадстаўлена на шырэйшым фоне становішча сродкаў масавай інфармацыі ў Беларусі. Варта дадаць, што напрыканцы мінулага года гэты фільм перамог на міжнародным фестывалі „Свабода слова ў краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы", арганізаваным асацыяцыяй „Журналісты без межаў" з сядзібай у Вене.

Наш супрацоўнік Мікола Ваўранюк атрымаў вылучэнне за фільм „Іканастас і музыка". Герой рэпартажу — мінскі жывапісец і музыкант Алесь Лось, расказвае пра сэнс і асаблівасці сваёй працы на Беласточчыне.

У фестывалі спаборнічала 31 са 100 надасланых фільмаў. Іх тэматыка датычыла жыцця на памежжы культур, рэлігій, нацый. Лаўрэаты атрымалі між іншым статуэткі св.св. Кірылы і Мяфодзія — патронаў Еўропы.

Беларускія журналісты яшчэ раз праявілі свой прафесіяналізм і трапную падборку тэмы. Віншуем! (гак)

Памяць аб будучым

Чым далей у глыб гадоў адыходзяць падзеі найбуйнейшай тэхнагеннай катастрофы мінулага стагоддзя — аварыі на Чарнобыльскай АЭС, тым менш у паўсядзённым жыцці ўзгадваюць іх людзі. Гэта зразумела, бо ўсялякія раны, нанесеныя нават самымі жудаснымі жыццёвымі здарэннямі, гоіць час. Але заплюшчванне вачэй на тое, што было і яшчэ баліць можа прывесці да небяспечных наступстваў.

Выбух ва ўкраінскім Чарнобылі, што прагучаў 17 гадоў таму, для многіх жыхароў Беларусі стаў свайго роду падзелам жыцця. Новая навала ўспрымалася як вайна. Таму часцяком па некалькіх гадах з вуснаў многіх чарнобыльскіх перасяленцаў у расповедах аб сваім жыцці можна было пачуць такія выразы „да вайны, пасля вайны". І тычылася гэта менавіта падзей красавіка 1986 года.

Пятая частка тэрыторыі Беларусі аказалася пад радыёактыўнымі ёдам, цэзіем, стронцыем. І пятая частка жыхароў апынуліся пад пагрозай захварэць невылечнымі хваробамі. Самі яны, зразумела, пра гэта не ведалі. Аднак ведалі тыя, хто сядзеў у вялікіх кабінетах і стараўся „не дапусціць паніку" сярод насельніцтва. А па сутнасці, здзяйснялі злачынства, бо ўтойвалі ад людзей жыццёва важную інфармацыю, робячы выгляд, што нічога страшэннага не адбылося і выводзілі на першамайскія дэманстрацыі дзяцей і моладзь пад пыл яшчэ не паспеўшага распасціся напалову, бо не прайшло яшчэ васьмі дзён, радыеактыўнага ёду, а ўвосень накіроўвалі на сельгасработы ў падлеглыя да адсялення вёскі студэнтаў і навучэнцаў.

Але ўсё гэта ў мінулым. Сёння на мапе свету няма той краіны, дзе гэтыя падзеі адбываліся. Тым не менш, пры сваіх пасадах засталіся тыя, хто тады кіраваў і накіроўваў. І засталіся тыя, аб кім першыя ўзгадваюць без асаблівай ахвоты — хворыя на лейкемію дзеці і старыя, што дагэтуль жывуць у радыяцыйных хатах неадселеных вёсак.

Ужо некалькі гадоў ідзе ў Беларусі так званая рэабілітацыя забруджаных раёнаў. Многія населеныя пункты пераводзяцца ў разрад чыстых, жыхары пазбаўляюцца дадатковых ільготаў, перад мясцовым кіраўніцтвам ставіцца задача „падцягнуцца" да ўзроўню непацярпелых рэгіёнаў. Такому стаўленню ў многім спрыяюць навуковыя выкладкі міжнародных экспертаў, якія ўжо не лічаць наступствы Чарнобыля занадта жудаснымі. Больш таго, згодна мінулагодняму дакладу ААН „Гуманітарныя наступствы аварыі на ЧАЭС", у насельніцтва, што пацярпела ад катастрофы, з'явіўся так званы „комплекс ахвяры", якога трэба пазбавіцца, пачаўшы аднаўленне на працягу дзесяці гадоў нармальнага жыццёвага працэсу.

Спрачацца са спецыялістамі могуць толькі спецыялісты, але падаецца, што Беларусь, хоць і найбольш пацярпелая ад катастрофы, першая адрапартуе аб агульнай рэабілітацыі забруджаных тэрыторый. Як гэта было з рэабілітацыяй ахвяр сталінскіх рэпрэсій. Менавіта да такой думкі наводзіць цяперашняе замоўчванне ўсёй праўды аб аварыі з боку сённяшняй беларускай улады. Але гэтае замоўчванне вельмі нагадвае тое, што было 17 гадоў таму. Наступствам замоўчвання будзе забыццё.

Беларуская апазіцыя ў Мінску наладзіла традыцыйны жалобны „Чарнобыльскі шлях" у выглядзе шэсця і мітынгу пад лозунгам „Памяць дзеля будучыні". Удзел у мерапрыемстве прыняло каля 2 000-3 000 чалавек. Рэпрэсіўных дзеянняў з боку міліцыі амаль не было.

Дэманстрацыі з нагоды сумнай гадавіны прайшлі і ў шэрагу гарадоў Заходняй Еўропы. „Зялёныя", зважаўшы на наступствы Чарнобыля, зараз крытыкуюць планы будаўніцтва ў Еўрасаюзе яшчэ амаль 30-ці новых атамных станцый. Але, як бы не хацелася, выкарыстанне энергіі ядзернага паліва гэта прагрэс у развіцці чалавецтва. А ў гэтым развіцці, на жаль, ніхто не застрахаваны ад памылак і пралікаў, чым, дарэчы, і быў Чарнобыль. Таму вельмі важна памятаць аб яго ахвярах, бо гэта значыць — памятаць аб будучых пакаленнях.

Уладзімір Лапцэвіч

25 красавіка 2003 г. на 82 годзе жыцця
памёр Янка ЖАМОЙЦІН
— празаік, літаратурны крытык, публіцыст, грамадскі дзеяч.
Сям'і і блізкім Пакойнага словы шчырага спачування
з прычыны напаткаўшага іх гора
выказвае рэдакцыйны калектыў „Нівы".

Не асіметрычнасць, а ўзаемнасць

[1 ☞ працяг]

Невядома яшчэ, колькі будзе каштаваць віза. Кіраўнік польскага знешнепалітычнага ведамства сказаў, што польскі бок запрапанаваў, каб шматкратная многагадовая віза каштавала некалькі еўра. Прэс-сакратар МЗС Беларусі Андрэй Савіных на брыфінгу 17 красавіка паведаміў, што максімальны размер візавага збору не будзе большы за 10 еўра. Дыпламаты не выключаюць, што кошт аднаразовай візы можа скласці 5-7 еўра. Даволі абшырны спісак тых, хто можа атрымаць шматкратныя візы, прычым на 50% таннейшыя за звычайныя. Запрашэнні для атрымання віз не будуць патрэбны, толькі на мяжы грамічныя службы могуць папрасіць пацвярджэнне плацежаздольнасці. Дыпламаты дамовіліся, што візы будуць выдавацца на працягу 5, а ў некаторых выпадках і 2 сутак.

Канчатковае рашэнне аб кошце візы будзе залежаць ад велічыні аплат, якія захочуць увесці Расія і Беларусь. „Будзем спасылацца на прынцып узаемнасці, — сказаў міністр Владзімеж Цімашэвіч, — паколькі цяжка было б адобрыць такую сітуацыю, што вось польскія грамадзяне плацілі б значна больш за расійскія ці беларускія візы, чым грамадзяне гэтых краін уязджаючы ў Польшчу".

Віталь Луба

Душой і сэрцам за беларускую справу

З пачаткам гэтага года выйшаў на пенсію вядомы дзеяч беларускага слова і адданы распаўсюджвальнік „Нівы" Мікалай ПАНФІЛЮК. З гэтай нагоды размову правёў з ім Віктар БУРА.

Віктар Бура: — *Раскажыце крыху пра сваё дзяцінства і маладосць.*

Мікалай Панфілюк: — Нарадзіўся я 3 студзеня 1943 года ў Дубічах-Царкоўных. Дзяцінства маё праходзіла так, як і ўсіх маіх равеснікаў: гульні, хованкі, дракі, а зімою катанне на каньках і з'язджанне на санках з горкі.

У 1950 годзе пайшоў я ў першы клас дубіцкай школы. Настаўнік беларускай мовы, мой сваяк Трахім Панфілюк, прынёс пад пахай кучу беларускіх букваро́ў: адна тая кніжка выпадала на траіх вучняў. Я кніжкі шанаваў, але двух маіх сяброў не, і таму на заканчэнне навучальнага года аддавалі мы адну рострась.

Мая сястра была ўжо дзеўкай і ў хату маіх бацькоў у доўгія асеннія і зімовыя вечары збіралася моладзь. Дзяўчаты пралі воўну, а хлопцы расказвалі неверагодныя гісторыі — было цікава і займальна.

Навука давалася мне лёгка і я хутка засвоіў беларускую, польскую і рускую мовы. Кніжкі, што бацька прывозіў з Варшавы, дзе зімою працаваў на чыгунцы, я ўміг прачытваў.

Вясною 1953 года мае бацькі перасяліліся на канец вёскі, на сядзібу маіх дзядзькоў, якія выехалі на пастаяннае жыхарства ў БССР. Адбылося гэта 5 сакавіка, акурат у дзень смерці Сталіна. Мясцовыя ўлады не дазвалялі бацьку будавацца, гаворачы, што ўсё дзяржаўнае; дазвол абяцалі даць, калі бацька запішацца ў калгас — бацька згадзіўся, але не адразу.

Летам 1956 года здарыўся нешчаслівы выпадак, калі я ў выніку неасцярожнасці трапіў пад калгасную снапавязалку. Ачнуўся я пасля некалькіх тыдняў у гайнаўскім шпіталі. Хаця ўсё помніў і разумеў, аднак страціў мову, таму нанава мусіў вучыцца гаварыць. У выніку гэтай падзеі я пабаяўся вучыцца ў сярэдняй школе; шкада, бо быў шанс на большую адукацыю.

Вясною 1956 года пісьманосец прынёс у нашу хату першы нумар „Нівы". Я быў па-святочнаму захоплены, быццам прадчуваючы, што неўзабаве „Ніва" стане мне найбольшым другам і настаўнікам. Восенню 1959 года выслаў я ў рэдакцыю „Нівы" дзве кніжкі: „Беларускі каляндар на 1912/13 гады" з „Нашай Нівы" і „Гісторыю беларускай літаратуры" Максіма Гарэцкага, выдадзеную ў Вільні ў 1924 годзе. За гэтыя кніжкі рэдакцыя прыслала мне 50 злотаў; на той час былі гэта вялікія грошы. І так пачалося. Скора стаў я пасылаць свае допісы, якія траплялі на старонкі „Нівы"; і так вядзецца па сённяшні дзень.

— Чым Вы займаліся да працы пісьманосцам?

— Калі падрос і стаў амаль кавалерам, хадзіў на забавы, сезонна працаваў пры пасадках у лесе або дарожнікам у нашай гміне, а вечарамі чытаў кніжкі, якія за збярэжаныя грошы купляў у кнігарнях і выпісваў па пошце; таму ў мяне сёння вялікая бібліятэка. Таксама з сябрамі арганізавалі мы забавы і музычныя мерапрыемствы, ставілі сцэнічныя пастаноўкі. Паказвалі мы п'есы „Мікітаў лапаць", „Суд" і іншыя. Выступаў у іх і я і нават нядрэнна выходзіла.

— Шмат гадоў неразлучны Вы з паштовай сумкай. На якім транспарце вазілі Вы яе?

— На штат пісьманосца стаў я 2 верасня 1965 года; да тае пары я некалькі разоў заступаў лістаношаў у водпуску. Першыя 4-5 гадоў вазіў я пошту на веласіпедзе; была гэта цяжкая праца, але паколькі быў я тады малады, дык тае цяжкасці не адчуваў. Пасля купіў я мотаровар „Камар" з педалямі і праца стала лягчэйшай і выгаднейшай. На другім мотаровары ездзіў я аж да пенсіі, бо яго даглядаў мой сын — механік.

— Колькі кіламетраў праехалі Вы з поштай?

— Штодзень я з сумкай на плячах праязджаў каля трыццаці кіламетраў. За час усёй сваёй працы аб'ехаў я, думаю, зямны шар двойчы.

— Што Вы з мінулага прыгадваеце як найбольш плённае ў параўнанні з сённяшнім днём?

— Мне запамяталася найбольш як Вы, спадар Віктар Бура, ездзілі з кінаперасоўкай і цікавымі фільмамі па вёсках, а людзі прагна гарнуліся паглядзець карціны і пачуць Ваша цёплае беларускае слова, калі Вы арганізавалі розныя конкурсы, каб зацікавіць роднымі культурай, словам, гісторыяй, традыцыяй. Помню, што кожны такі конкурс меў сваё глыбокае значэнне. Мы, вясковая моладзь, таксама ладзілі пастаноўкі з роднымі песнямі. Сёння гэтага няма, моладзь апалячылася, адно толькі не забывае брыдкай колішняй лаянкі.

— Якія ўзнагароды атрымалі Вы за сваю працу?

— За добрую працу на пошце атрымаў я бронзавы, сярэбраны і залаты медалі „Заслужаны працаўнік сувязі". Атрымаў таксама некалькі ўзнагарод і ганаровых дыпломаў ад рэдакцыі „Нівы" — за карэспандэнцкую дзейнасць і за развіццё роднага слова, калі ў маім паштовым участку сабіраў я да чвэрці тысячы гадавых падпісчыкаў „Нівы"; гэта доўжылася больш за дваццаць гадоў.

— Ці бывалі якія цікавыя або нецікавыя здарэнні ў Вашай працы або жыцці?

— За час сваёй працы на пошце я дакладна пазнаў характар, менталітэт і душу нашага чалавека — беларуса і магу з гонарам заявіць: чалавек — гэта гучыць горда! Сэрца цешыцца, што нашы людзі добрыя. Многія з іх сталі мне блізкімі, напрыклад, Сцяпан Мрук з Тапаркоў ці Пётр Багроўскі з Руткі. На жаль, былі і нецікавыя здарэнні, калі я несправядліва ганіў Аляксандра Баршчэўскага і Васіля Петручука; калі б час вярнуўся, я ніколі так не зрабіў бы, але ад сэрца пахваліў бы, бо яны — наш гонар і святло.

— Як Вы адчуваеце сябе ў ролі пенсіянера?

— Тужу па працы, па сябрах з пошты, бо жылі мы як родная сям'я. Начальнік пошты, Марыя Кардаш, гэта прыгожая і ветлівая жанчына, якая трымае ў працы лад і парадак. І лістаношы Жэня Несцярук, Алек Невядомскі і Андрэй Казімерук гэта добрыя і сціплыя паштавікі. На развітальную вячэру ў маім доме прынеслі яны мне дарагі і каштоўны падарунак, за які сардэчна ім дзякую на старонках „Нівы".

У вольны час пішу допісы ў „Ніву", пішу беларускія вершы. Чытаю кнігі, а з найбольшай павагай Біблію, бо яна як сонца сярод іншых кніжак-планет.

— Дзякую за размову.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Дырэктар Анна Грыцук прывітала гасцей

Гарадоцкая чыгунка ў Еўрасаюз

[1 ☞ працяг]

— дадаў. — Гэта вялікая каштоўнасць, якая ўплывае на якасць нашага жыцця.

Ці скажуць „так" Еўрасаюзу?

Сярод экспертаў з'явіўся пасол Яўген Чыквін, які разам з рэдактар Аннай Радзюкевіч прадстаўлялі „Przegląd Prawosławny".

— Мы ані за, ані супраць Еўрасаюза, — адзначыў становішча газеты пасол. Яўген Чыквін меў гаварыць пра перспектывы нацыянальных і рэлігійных меншасцей. Засяродзіўся ён на юрыдычным аспекце праблемы, пры тым карыстаўся сухой чыноўніцкай фразеалогіяй незразумелай для большасці публікі.

— O Unii bez obaw, prawdziwie, — выказваўся Марк Кендзяжаўскі з Аховы прыроды. — Мы не маем чаго баяцца, — гаварыў, — ахова прыроды ў нас часта на вышэйшым узроўні як у Еўрасаюзе. Зараз думаем пра шчыльнейшае супрацоўніцтва з Беларуссю.

Еўрапейскія стандарты прысвоілі ўжо працаўнікі гранічнай службы. Маёр Марк Баравецкі гаварыў пра карысці ад жыцця ў прыгранічнай зоне. Выявіў спадзяванне, што частка моладзі ў будучыні „będzie nosić taki jak ja mundur".

Сустрэча зацягнулася і выклікала жывыя каментарыі сярод дарослых. Запрошаныя госці віншавалі з ініцыятывай дырэктара гімназіі Анну Грыцук і старшыню клуба. Аляксандр Карпюк адзначыў, што сродкі на мерапрыемства прыдбала гімназія.

— Моладзь ведае, што ад рашэння дарослых залежыць іх будучыня. Многія гімназісты будуць размаўляць пра Еўрасаюз з бацькамі і дзядулямі. Мы спадзяемся, што бацькі возьмуць пад увагу веды дзяцей і скажуць **ТАК** Еўрасаюзу, — кажа Аляксандр Карпюк.

Гімназісты з Еўрапейскага школьнага клуба прызнаюцца: „Дарослыя не надта хочуць нас слухаць. Але што гаварыць пра іх! — нашы сябры не цікавяцца праблемай, бо «і так ведаюць» — што нічога не зменіцца".

У пастаноўцы „Цягнік у Еўрасаюз" скрытыкавалі схільнасць да наракання і бяздумнага паўтарання міфаў пра пагрозы ад Еўропы.

Ганна Кандрацюк

Дарожныя інвестыцыі

Праграма дарожных інвестыцый у Гайнаўскім павеце на 2003-2006 гады прадбачвае выкананне каля 60 кіламетраў паверхневага замацавання гравійнага палатна дарог (падобнага на асфальтаванне). Плануецца таксама выкананне бітумічных насцілаў і тратуараў (даўжынёй каля 6 км). Найбольш дарог прадбачваецца рамантаваць у Нарваўскай (11,6 км), Нараўчанскай (9,9 км), Гайнаўскай (9,5 км), Кляшчэлеўскай (9,5 км) і Чыжоўскай (8 км) гмінах. Найменш дарог будзе рамантаваных у Белавежскай (3 км) і Чаромхаўскай (4 км) гмінах, але гэтыя гміны самыя малыя ў павеце (адлічыўшы лясныя тэрыторыі). Больш складаныя інвестыцыі будуць праводзіцца ў Гайнаўцы (выкананне бітумічных насцілаў і тратуараў) і таму будуць рамантаваны там толькі 5,4 км дарог. Радны Славамір Кулік лічыць, што замала сродкаў прызначаных на дарожныя інвестыцыі ў Дубіцкай гміне (5,2 км).

— У гміне Дубічы-Царкоўныя, як у адзінай, у 2006 годзе не будуць рэалізавацца дарожныя інвестыцыі. Пералічваючы кошты інвестыцый на аднаго жыхара гміны і зважаючы на даўжыню рамантаваных дарог трэба адзначыць, што Дубіцкая гміна пакрыўджаная, — мяркуе радны Славамір Кулік. Запрапанаваў ён на сесіі, каб на 2006 год запланаваць рамонт 2 км дарогі Істок — Вітава, які меў бы каштаваць 120 тысяч злотых, але прамоўца не ўказаў на канкрэтныя крыніцы сродкаў патрэбных на яго сфінансаванне. Намеснік старасты Ежы Сірак адзначыў, што прапанова не разглядалася ў камісіях, а стараста Уладзімір Пятрочук падкрэсліў, што ў мінулай кадэнцыі многа дарожных інвестыцый праводзілася менавіта ў гміне Дубічы-Царкоўныя. Ніхто з павятовых радных, апрача Славаміра Куліка, не падтрымаў дубіцкую прапанову.

Многія рамонты дарог будуць выконвацца з выкарыстаннем гмінных бюджэтных сродкаў, структурных фондаў Еўрасаюза, дапаможных фондаў „SAPARD" і „PHARE" і рэзерва дарожнай субвенцыі Міністэрства інфраструктуры. Павятовыя ўлады разлічваюць таксама на дапамогу грамадскіх камітэтаў дапамогі дарожным інвестыцыям.

Аляксей Мароз

Год Гасана Канапацкага

„Аль-Іслам" — часопіс Згуртавання мусульманскага адзінства аб'явіў 2003 год — годам Гасана Канапацкага.

„У 2003 годзе мінае 50 гадоў ад смерці палкоўніка Гасана Канапацкага, камандзіра Беларускіх атрадаў на тэрыторыі Польшчы ў 1919-1920 гадах, — чытаем у 4 (163) нумары часопіса за 2002 г. — Палкоўнік, нягледзячы на свае вялікія заслугі, быў вельмі сціплым чалавекам, таму хочам, каб гадавіна яго смерці была прычынай для таго, каб у 2003 годзе (напрыклад, у перыяд дуа) успамінаць тых мусульман, якія заслужыліся ў гісторыі, а памяць аб якіх быццам бы сцерлася. Успамінайма тады палкоўніка Канапацкага, палкоўніка Сулкевіча, Садыка Пашу, Джэннет Скібнеўскую, а таксама тых безыменных у гісторыі нашых братоў і сясцёр у ісламе, якія апрача таго, што былі мусульманамі, былі таксама патрыётамі".

Ідэю года Канапацкага падтрымоўваюць Мусульманскі інстытут у Варшаве і Гурток ваеннай традыцыі генерала Станіслава Булак-Балаховіча.

Гасан Канапацкі нарадзіўся 25 лютага 1879 г. у Мінску ў шляхецкай мусульманскай сям'і. Закончыў Полацкі корпус кадэтаў і Артылерыйскую школу імя князя Канстанціна ў Пецярбургу. Прымаў удзел у руска-японскай вайне 1904-1905 гг. У час першай сусветнай вайны камандаваў першым паркам 57 Брыгады палявой артылерыі, затым 69 Брыгадай палявой артылерыі. Пасля атручэння баявымі газамі пераведзены быў у тылавы эвакуацыйны пункт у Мінску.

У час знаходжання ў Мінску ўключыўся ў беларускі нацыянальны рух. Пасля заняцця Мінска польскім войскам у 1919 г. апынуўся сярод прыхільнікаў адраджэння Беларусі пры баку Польшчы. Уваходзіў у склад Беларускай вайсковай камісіі і быў назначаны камандзірам беларускага войска. Мела яно арганізавацца ў Слоніме і Баранавічах. Пасля адступлення палякаў улетку 1920 г. Беларуская вайсковая камісія пераехала ў Лодзь, а ў 1921 г. беларускія падраздзяленні былі распушчаны.

Палкоўнік Канапацкі ў міжваенны перыяд жыў у Вільні і працягваў дзейнасць у беларускім нацыянальным руху. У 1928-1929 гг. загадваў рэдакцыяй часопіса „Беларускі радны", старшыняваў Цэнтральнаму агульнабеларускаму народнаму выбарчаму камітэту ў 1928 г.

У час нямецкай акупацыі супрацоўнічаў з газетай „Беларускі голас", якая выдавалася ў Вільні і быў старшынёю бацькоўскага камітэта Віленскай беларускай гімназіі, у якой вычыўся ягоны сын Мацей, пазнейшы журналіст „Нівы" і рэдактар беларускіх перадач на Беластоцкім радыё (1957-1964). У 1946 г. пераехаў з сям'ёй у Быдгашч, дзе памёр 11 мая 1953 г.

11 мая г.г. у Быдгашчы з удзелам шыіцкага імама Махмуда Бергера будзе адзначацца 50 гадавіна з дня смерці Гасана Канапацкага. (вл)

Вачыма паляка

Каляпасхальныя назіранні

Свята Уваскрэсення павінны даводзіць да радасці, даваць надзею, схіляць да рэфлексіі, хоць бы звязаных з гэтым, што ніколі мы не адны. Неяк так склалася, што сёлета каталіцкі Вялікдзень і праваслаўную Пасху правёў я адзін, значыць, толькі з сабакам, перад тэлевізарам. Усе мае найбліжэйшыя адышлі, а рэшта сям'і далёка, не толькі геаграфічна. Так што меў я шмат часу на думкі, можа, нават і замнога. Не ведаю толькі, нашто я выдаў большасць з месячнага заробку, каб саставіць (дарэчы, двойчы) святочны стол. Зрабіў качку з яблыкамі, курача-свіны паштэт, спёк грудзінку і свіное філе. Не ўспамінаю ўжо пра яйкі, бо ўжо нават на іх успамін робіцца мне блага. Сядзеў я так два святы пры застаўленым стале, што і руш частуючы сабачку, які пух ад абжорства, шчасліва качаўся па дыване і што некалькі гадзін радасна падскокваў на лузе ў час нядзельна-панядзелкавых шпацыраў. Між чарговымі талерачкамі ежы спазіраў я ў акно (як прыказкавая старая баба). Калі я сядзеў так сабе ля акна, падумаў, чаму мы не ўмеем выказаць свае любові да найбліжэйшых, хоць, здавалася б, ведаем, што так хутка адыходзяць.

Святы святамі, а г.зв. жыццё коціцца далей. Так сёлета ўзяло дый парабілася, што ў праваслаўную Вялікую суботу абабегла некаторыя агенцтвы вестка, перададзеная на інтэрнэтавых старонках ізраільскіх узброеных сіл, быццам бы Садам Гусейн разам з двума сынамі і блізка трымастамі найбліжэйшымі супрацоўнікамі і аховай скрыўся ў Беларусі. Я пільна прыслухоўваўся весткам з „Навасцей", мінскім навінам у тэлебачанні. Ніякага абвяржэння не было. У некаторых, дарэчы, нешматлікіх польскіх каментарыях заўважылі, што гэта лухта. Тэму падняла TVN 24. Каментатарка дайшла там да высновы, што гэта, здаецца, немагчыма, бо прэзідэнту Лукашэнку не дазволіў бы на такое прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін. Цікавая гэта думка, паколькі патрабавала б пацвярджэння ў маскоўскіх крыніцах, а гэтак не было. Падобна, дарэчы, як ізраільская „сенсацыя" не была пацверджана ніякімі верагоднымі крыніцамі, бо на старонках Інтэрнэту кожны можа панавыпісваць якія хоча гісторыі. Дык нашто распаўсюджваць такую інфармацыю?

На канец калясвяточна, і, магло б здавацца, сімпатычна. Першы раз, адкуль памятаю, падляшскі куратар асветы заклікала ваяводскія школы, у якіх вучацца праваслаўныя дзеці, каб у панядзелак 28 красавіка адклікаць заняткі. Урэшце, так сказаць. Аднак заклік пані куратар Зофіі Транцыгер-Кочук датычыў свабоднага дня (а не, як дагэтуль, толькі звальнення з заняткаў праваслаўных вучняў) у выбраных самімі дырэктарамі школах, дзе вучацца праваслаўныя дзеці. Наколькі я зразумеў ранейшыя інтэнцыі меншасных арганізацый, у прапанове вольнага дня ў праваслаўныя Вялікдзень і Каляды, справа датычыла б усіх без выключэнняў школьных устаноў у ваяводстве. Так, каб усе польскія дзеці маглі адчуць, што калегі з класа іншага веравызнання перажываюць такую самую радасць з нараджэння і ўваскрэсення Хрыста і што могуць удзельнічаць у гэтай радасці, і можа быць, пазнаць іншую традыцыю. Так, аднак, пакуль што не здарылася, хоць добра, што справа зварухнулася. Час, аднак, пакуль яшчэ г.зв. палітычная атмасфера спрыяе, выпрацаваць агульнапольскія прынцыпы, якія рэгулявалі б святочныя пытанні, таксама ў адносінах да іншых канфесійных меншасцей і іншых школ, дзе дзеці, якія выводзяцца з гэтых асяроддзяў не лічацца ў шматлікай групе (як гэта лічыць?) ды незалежна ад таго як уздумаецца дырэктарам асветных пляцовак. А так, дарэчы, у шляхетным з інтэнцыі закліку пані куратар скрывалася нейкае каварства. Прапанавала яна школам, якія ў праваслаўны Вялікдзень адменяць заняткі, адпрацаваць іх або сарганізаваць заняткі пазаўрочныя. Так, вось, праваслаўныя дзеці маглі адчуць сябе пакаранымі такім „з ласкі" свабодным днём.

І яшчэ адно. Зараз перад тым, як аддаў я тэкст у друк (якраз у велікодны панядзелак) у Кураторыі я даведаўся, што 62 школы на Падляшшы адмянілі заняткі. З іх 19 гэты дзень адпрацуюць. 20 школ не будзе гэтага рабіць ні арганізаваць дадатковыя заняткі, як прапанавала пані куратар. Будзе так, паколькі больш за 30% у іх гэта праваслаўныя вучні. Гэтыя лікі могуць змяніцца, паколькі інфармацыі яшчэ наплываюць у кураторыю.

Мацей Халадоўскі

Беларуская дзяржаўнасць — эканамічныя перспектывы

У днях 18-19 красавіка Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт арганізаваў канферэнцыю прысвечаную беларускай дзяржаўнасці ў XX стагоддзі. Найбольшае зацікаўленне выклікалі даклады аб праблемах сучаснай дзяржавы. Інтэлектуальнае асяроддзе ў гэтай справе вельмі падзеленае. На жаль, сярод вучоных шмат прыхільнікаў лукашэнкаўскай палітыкі, накіраванай на інтэграцыю з Расіяй, што на практыцы, нягледзячы на рыторыку ўлады, абазначае ліквідацыю беларускай дзяржавы.

З вялікім энтузіязмам пра планаваную інтэграцыю гаварыла Надзея Місарэвіч, выкладчык міжнароднага права Гродзенскага універсітэта. Заклапочанасць вучонай выклікалі толькі юрыдычныя абумоўленасці, напрыклад, як мела б звацца такая дзяржава, якія мець сімвалы, які гімн. Місарэвіч даказвала, што беларусам найбольш выгадна будзе існаваць у адной дзяржаве разам з расіянамі. Слухаючы ейны даклад я спадзяваўся бурлівых рэакцый на такія словы, але ўсё прайшло без эмоцый. Прысутныя пыталі толькі пра тое, як пераадолець фармальныя перашкоды на дарозе да інтэграцыі краін ці, як гавораць іншыя, інкарпарацыі Беларусі. Тыя, якіх абуралі словы гродзенскай дакладчыцы, маўчалі.

Наогул у публічных месцах у Беларусі ніхто цяпер шчыра нічога не гаворыць, хіба што шэптам і толькі даверaным людзям. Апошнім часам Лукашэнка лаяў па тэлебачанні ўсю беларускую прафесуру за тое, што не прымае ўдзелу ў выхаванні моладзі дзеля інтэграцыі. Сацыялагічныя апытанні паказваюць, што сярод студэнтаў прыхільнікаў палітыкі Лукашэнкі вельмі мала. Вінаватыя гэтаму аказаліся іх настаўнікі, таму што не праводзілі адпаведнай ідэалагічнай працы.

Даклад Леаніда Давыдзенкі, прафесара эканоміі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта, не пакідаў ніякіх сумненняў, якім шляхам павінна ісці Беларусь. Хаця ўзрастае валавы прадукт, гаварыў Давыдзенка, аднак выпрадукаваныя тавары не прадаюцца, усё адбываецца за кошт крэдыту і задоўжанасці. Трэба даць людзям свабодна працаваць. Хай узнікаюць прыватныя фірмы, тады будуць сапраўдныя падаткі. Толькі прыватны гандаль і прамысловасць могуць падняць гаспадарку, даць людзям працу і магчымасць зарабляць грошы. Дзеля гэтага неабходныя свабодныя цэны і адкрытыя межы для эканамічнага супрацоўніцтва з усім светам, а прынамсі з найбліжэйшымі суседзямі. Аднавектарная гаспадарчая палітыка, якая вядзецца на практыцы, не дае ніякіх магчымасцей адмяніць адмоўныя тэндэнцыі ў гаспадарцы.

Давыдзенка заўважыў, што адсутнасць якіх-небудзь перспектыў для інтэлектуалаў вядзе да спусташэння асяроддзя найбольш таленавітых грамадзян краіны, якія ўцякаюць там, дзе лепш плацяць. Беларусь, — падкрэсліў, — фінансуе падрыхтоўку кадраў для Амерыкі і краін Еўрасаюза, а нават Польшчы і Расіі. Масава выязджаюць на працу матэматыкі, фізікі, а замежныя універсітэты купляюць гісторыкаў, настаўнікаў англійскай ці нямецкай моў з навуковымі званнямі. Тым часам у эканоміцы адбываюцца пастаянныя бітвы за ўраджай, па тэлебачанні аб'яўляюць пасяўную акцыю, мабілізуюць калгаснікаў. Але колькі можна падымаць у бой тых няшчасных бабулек, якія не бачылі іншага, чым калгасны, свету? — пытаўся рытарычна дакладчык.

Ад 1991 да 2001 г., — прадаўжаў Давыдзенка, — адміністрацыйны апарат у Беларусі павялічыўся ў 1,8 раза (180 працэнтаў). Штораз бяднейшае грамадства вымушанае утрымліваць штораз большую армію чыноўнікаў, найчасцей малакампетэнтных, якія на практыцы блакіруюць любую грамадскую актыўнасць. Лукашэнкаўская вертыкаль павялічваецца цяпер у некантраляваны спосаб, на падобных прынцыпах як раней апарат камуністычнай партыі. Быць у радах вертыкалі — гарантыя сацыяльнай бяспекі. Улада „сваіх" не пакідае без сродкаў.

Слухаючы гэтыя словы, пажылая публіка, былыя дзеячы кампартыі і камсамола дэманстравалі сваю незадаволенасць. Адзін у перапынку такі пункт гледжання назваў ліберальным бальшавізмам. Тое, што ва ўсім свеце ў галіне эканомікі прымаецца за норму, у Беларусі бачыцца крайнім лібералізмам. „Рыначны сацыялізм", пабудову якога некалькі гадоў таму аб'явіў Лукашэнка, замацаваў несузгодную сістэму нават з расійскай гаспадаркай. Без вялікіх рэформаў Беларусь таксама і ў гаспадарчым плане будзе штораз больш ізаляванай краінай. У такіх умовах улады маюць толькі адзін выхад — гандляваць суверэнітэтам краіны.

Яўген Мірановіч

Шатландскія кельты (астравок Кільда), 1879 г.

Кельцкі фестываль на Гебрыдскіх астравах

http://www.w-isles.gov.uk/

Кельты ў Шатландыі

Паводле перапісу 1991 года ў Шатландыі пражывае амаль 66 тысяч жыхароў, якія сваёю мовай называюць кельцкую. Зразу трэба дапоўніць, што на тэрмін „кельцкі" англійская мова мае два словы — Celtic і Gaelic. Калі ідзе канкрэтна пра мову кельтаў у Ірландыі і Шатландыі, дык ужываецца гэты другі тэрмін. Шатландскія кельты жывуць кампактна на Заходніх астравах ды ў акрузе Скай і Лошальш (агулам больш за 24 тысячы), дзе складаюць большасць грамадства. Астатнія — расцярушаныя па ўсёй Шатландыі. У галоўных гарадах краіны, прыкладна, жыве кожны чацвёрты кельт. Эканамічны ціск прымушае насельніцтва перамяшчацца з традыцыйна кельцкіх рэгіёнаў (Гебрыдскія астравы і заходняе пабярэжжа Шатландыі) у горную Шатландыю і ўрбанізаваныя раёны ніжняй. Да традыцыйных заняткаў кельтаў належаць невялікія гаспадаркі, рыбалоўля, ткацтва і паслугі.

У Шатландыю кельты прыйшлі каля 500 года н.э. з поўначы Ірландыі і да XI стагоддзя ўфармавалі вялікае каралеўства са сваёю мовай, якое па тэрыторыі збольшага супадала з сучаснай Шатландыяй. З XI стагоддзя кельцкая мова пачынае траціць сваю адметнасць на каралеўскім двары і сярод арыстакратыі. У XVII стагоддзі мова кельтаў адступаецца ў горную Шатландыю і на Гебрыдскія астравы. Яе прызнанне ў дзяржаве адбываецца толькі ў познія гады XX стагоддзя. Усе сучасныя кельты двухмоўныя. Юрыдычны статус мовы нявызначаны, хоць брытанскі ўрад у 1985, 1986 і 1993 годзе прыняў некалькі распараджэнняў у падтрымку кельцкай мовы ў галіне адукацыі і вяшчання.

З 1918 года адукацыйныя законы бралі пад увагу і магчымасць навучання кельцкай мовы, але прагрэс у гэтай справе быў надзвычай марудным. У 1975 годзе новыя адукацыйныя ўлады Заходніх астравоў увялі двухмоўнае навучанне ў пачатковыя школы. У 1985 годзе пачатковае навучанне на кельцкай мове мела дзве школы, а да 1994 года ўстаноў такіх было 42. У сярэдніх школах кельцкая доўгі час вывучалася як прадмет праз пасрэдніцтва англійскай мовы. Увод двухмоўнага навучання не ўдаўся. У вышэйшых школах кельцкія курсы адбываюцца ў Эдынбургу, Глазга і Абердзін. Некаторыя з іх выкладаюцца па-кельцку, але гэта ўсё, што выкладаецца на гэтай мове ва універсітэтах.

Шатландскія законы не забараняюць ніякіх імёнаў. Некаторыя людзі зусім законна пераймяноўваюцца і карыстаюцца традыцыйна кельцкімі імёнамі ва ўсіх афіцыйных дачыненнях. Такая практыка аднак вельмі рэдкая. Затое вельмі папулярна стала надаваць дзецям кельцкія імёны пры нараджэнні. З 1972 года ў Шатландыі можна пакельцку запаўняць і падпісваць чэкі (уявіце, што заходзіце ў банк у Бельску або Гайнаўцы і выпісваеце чэк кірыліцай).

Большасць публічных будынкаў, вуліц, дарог і ўказальнікаў у Шатландыі значыцца на англійскай мове. Выключэннем тут Заходнія астравы і некалькі вельмі абмежаваных раёнаў. На Заходніх астравах афіцыйная палітыка накіраваная на ўжыванне двухмоўных назваў з аднолькавай важнасцю англійскай і кельцкай моў.

Прысутнасць кельцкай мовы ў шатландскім эфіры значна перавышае беларушчыну ў беластоцкім, хаця колькасці жыхароў, якія прад'явілі беларускую як мову хатніх зносін у час нашага перапісу можа быць вельмі блізкай кельтам. Тэлебачанне ў Шатландыі (Бі-бі-сі і шатландскі незалежны тэлеканал) выпускаюць 300 гадзін перадач на кельцкай мове ў год. Калі ўлічыць у тое паўторы, дык перадач тых атрымліваецца да дзевяці гадзін у тыдзень. Гледачы ў Шатландыі маюць таксама доступ да блізка 20 спадарожнікавых тэлестанцый і некалькіх кабельных сетак, але кельцкая мова ў іх адсутнічае. Кельцкая мова па радыё гучыць амаль выключна на Бі-бі-сі. Радыё транслюе 23,5 гадзіны кельцкіх перадач у тыдзень (Гебрыдскія астравы і горная Шатландыя) ды 11 гадзін у астатніх рэгіёнах Шатландыі. У кельтаў няма ані сваёй штодзённай газеты, ані тыднёвіка, які поўнасцю выходзіў бы на кельцкай мове. Шатландскія газеты змяшчаюць затое на гэтай мове асобныя артыкулы або старонкі.

Дзяржава дапамагае кельцкаму кнігавыдаванню прызнаючы гадавыя гранты Кельцкаму кніжнаму таварыству, якое заснавана пры Універсітэце ў Глазга. Падтрымка літаратуры і мастацтваў адбываецца праз Шатландскую раду мастацтваў у Эдынбургу. Вельмі моцны рост кнігавыдавання на кельцкай мове адбыўся за апошнія 25 гадоў. Самай жа вялікай праблемай у гэтым плане — дайсці да чытача, які жыве або на астравах, або ў слаба населеных рэгіёнах, у якіх кнігарня не самая частая крама. Кніжнае таварыства арганізавала дзеля гэтага сістэму аўтакрамаў (у нас жа па гэтай сістэме прадаецца не кніга, а хлеб і малако). Новых кельцкіх загалоўкаў з'яўляецца 30-40 у год. Шатландскія кельты праяўляюць асаблівае замілаванне да лакальнай „вясковай паэзіі", біяграфій і мясцовай гісторыі. Заўважальны таксама прагрэс у папулярнай і традыцыйнай кельцкай музыцы, якая складае істотную частку кельцкага радыё і тэлеэфіру. Запісы гэтай музыкі самаакупаюцца як камерцыйныя праекты.

Кельцкая мова адсутнічае ў камерцыйных дачыненнях — маецца тут на ўвазе гандаль і неадлучную ад яго рэкламу. Выключэннем — яно ўсё ж знойдзецца — два віды віскі, этыкеты якіх якраз на кельцкай мове. Можна аднак спакойна разлічваць, што разам з узростам значэння г.зв. „культурнага турызму" (у нас тое заіснавала як агратурызм), кельты і іхняя мова знойдуць сваё месца ў гэтым сектары гаспадаркі ды будзе ім гэта добрай нагодай падтрымліваць і сваю мову, і сваю традыцыю.

Аляксандр Максімюк

У Еўропе аднолькавых шанцаў

У рамках праекта „У Еўропе аднолькавых шанцаў" друкуем чарговы тэкст з цыкла 12 артыкулаў, прысвечаных нацыянальным меншасцям у краінах Еўрапейскага Саюза і Польшчы. Да артыкула прыкладзена конкурснае пытанне. Аўтары правільных адказаў возьмуць удзел у штотыднёвай жараб'ёўцы трох кніжных узнагарод, а на канец праекта — галоўнага прызу: набору дапаможнікаў для вывучэння англійскай мовы. Спонсарам праекта з'яўляецца Управа Камітэта еўрапейскай інтэграцыі.

Projekt wydawniczy zrealizowano przy współpracy z Urzędem Komitetu Integracji Europejskiej w ramach konkursu otwartego dla mediów-2003.

Міхалова

Што ў 2003 годзе?

Шмат інвестыцыйных работ запланавалі сёлета ў Міхалоўскай гміне.

У Міхалове будуць перабудаваны вуліцы: Аградовая (480-метровы адрэзак), Падгорная (440 м) ды Польная (380 м) за кошт 1 млн 645 тысяч злотаў. Апрача таго будуць мадэрнізаваць ачышчальню сцёкавых вод (за кошт 100 тысяч зл.), разбудоўваць водаправодную лінію па вуліцы Вырэмбы ды будаваць санітарную каналізацыю па вуліцах Вярбовай, Тапалёвай, Гарадоцкай, Вузкай, Горнай, Жвіркі і Вігуры.

Гмінныя ўлады вырашылі перабудаваць дарогі: з Пянькоў у Капцы (3,2 км) за кошт 400 тыс. зл., з Шымкаў у Цісоўку (4 км) за кошт 450 тыс. зл. ды ў Лявонавічах (1,7 км) за кошт 255 тыс. зл. Сёлета будуць яшчэ працягваць пабудову дарогі ў Падазеранах за кошт звыш 200 тыс. зл.

У Міхалоўскай гміне будуць разбудоўваць вулічнае электраасвятленне ў некаторых вёсках за кошт 40 тыс. зл., ды пракладаць тратуары ў Новай Волі і Шымках за кошт 165 тыс. зл.

Сёлета пачнецца пабудова вадасховішча на рацэ Супрасль за кошт 50 тыс. злотаў. Будуць добраўпарадкоўваць пляж ля Семяноўскага вадасховішча, а таксама мол там жа за кошт 40 тыс. злотаў.

Янка Целушэцкі

8 конкурснае пытанне

Як называецца шатландскі тыднёвік, які поўнасцю друкуецца на кельцкай мове?

Адказ: .....

.....

.....

.....

.....

.....

.....

.....

.....

Імя і прозвішча: .....

Адрас: .....

(Каб правільна адказаць на пытанне трэба ўважліва прачытаць надрукаваны побач артыкул. Адказы просім дасылаць на гэтым талоне на адрас рэдакцыі. Тэрмін дасылання адказаў — да 18 мая 2003 г.)

Узнагароды...

... за правільны адказ на ***5-яе конкурснае пытанне*** атрымоўваюць: **Анна Алясюк** з Бельска-Падляшскага, **Канстанцін Белюк** з Сідаркі ды **Казімір Радошка** са Свебадзіцаў.

Зорка

старонка для дзяцей

Наталля і Альжбета

Наталька Швед і Альжбета Юшчук неўзабаве закончаць пачатковую школу і пойдуць у гімназію. З першага класа яны вывучаюць беларускую мову.

Дзяўчаты самі падрыхтавалі сцэнарый святкавання 78 гадавіны з дня нараджэння Віктара Шведа. Паэту спявалі дзеці з калектыву „Галілея", а пасля выступілі з яго вершамі. Кожнае выступленне было прыздоблена каментарыем. Напрыклад, калі меў прагучаць верш пра ката, дзяўчаты расказалі пра культ гэтай жывёлы ў старажытным Егіпце. Разам з сусветным кантэкстам паказалі наш — беластоцкі. Прытым прадэманстравалі знаёмства нашых асаблівасцей. Калі меў прагучаць верш пра вясну, Альжбета распавяла пра бярозавы сок. Гэты напой пілі беларусы, каб вясной прыдбаць сабе моц. Старэйшыя слухачы выразна ажывіліся, многія з іх прыгадалі смак незабыўнага напою.

— Ці ваш сцэнарый паўстаў на ўроку беларускай мовы? — спытала „Зорка".

— Не, мы самі напісалі, — кажа Эля, — крыху дапамагла нам мама Наталлі.

— А наша настаўніца беларускай мовы паабяцала паставіць нам за сцэнарый шасцёркі, — дадала Наталля.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Альжбета Юшчук і Наталька Швед

Дзяўчаты самі вялі мерапрыемства. Кожны, хто пачуў іх выступленне, звярнуў увагу на дбайнасць вымаўлення. Праўда, былі ў іх дробныя памылкі з націскам, але адчувалася найважнейшае — патрэба дасканалення мовы. Для прыкладу, яны ўжо натуральна вымаўляюць „л".

У „Галілеі" спяваюць дзеці з усяго Беластока. Большасць з іх дэкламавала вершы Шведа ў перакладзе на польскую мову. Толькі навучэнцы ПШ н-р 4 і ПШ н-р 11 ды польска-беларускага садка — усе як адзін выступілі з беларускімі вершамі.

ЗОРКА

Крыніца

Кветка ў лузе
Расцвітала,
Нізка голаў нахіляла,
Паглядала
Вокам-знічкай
На сцюдзёную крынічку.

А крынічка
Булькатала,
Быццам песні напявала,
І паіла ўдосталь
Кветку
Ў гарачынь-сухмень улетку.

Салавейка галасісты
Піў ваду
З крынічкі чыстай.
Да крынічкі
Ясным золкам
Прыляталі перапёлкі...

Дзве вавёркі
Прыбягалі,
Лось рагаты з лесу-гаю.
І хапала ўсім
Вадзіцы
Ў той маленькае крыніцы.

Авяр'ян Дзеружынскі

Вясна

Вясна — прыгожая пара.
Лес бы зялёная сцяна,
Лёд пакідае блакітную раку,
Снегавікі будуць гнаць зіму.
Я вельмі люблю вясну.

Дожджык

Дожджык малы.
Дожджык доўгачаканы
Падае згары,
Падлівае траву
І памагае гаспадару.

Хата

Люблю я сваю хату,
У хаце — багата.
Сумую па хаце,
Калі развітваюся з ёю.

Ева Бэнэдычук (Ляхі)

Польска-беларуская крыжаванка № 19

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 15: Ас, сыр, прастор, пробка, праграма, палац, азарт, рыса, мат, сад, Ян. Сноп, ара, плыт, прас, праца, рог, абраза, сказ, атаман, ар, ара, тын.

Узнагароды — алоўкі — выйгралі: **Кацярына Ягадніцкая** і **Кацярына Трашчотка** з Новага Корніна, **Радзік Галёнка** з Нарвы, **Наталля Петручук** з Дубін. Віншуем.

Найшла каса на камень

(літоўская казка)

Адзін скупы кулак да смерці не любіў парабкаў сваіх карміць. Як прыйдзе час палуднаваць — усім з дому хатулі ды збаны нясуць, а ў яго ўсё не так, як у людзей: то карова дайніцу перавярнула, то хлеб у печы згарэў.

А як сядуць суседзі ў халадок, кулак і кажа парабку:

— Адпачнём жа і мы, Йонас, пакуль усе палуднуюць. Няхай людзі думаюць, што мы з табой таксама ямо.

І гэтак кожны дзень.

Стаў галодны парабак думаць, як бы яму скупога гаспадара ад такой звычкі адвучыць. І вось аднойчы папалуднавалі суседзі, адпачываюць, а парабак схапіў касу і падняўся з месца.

— Чаго дарма сядзець, — кажа, — давай лепш папрацуем!

Хочаш ці не хочаш — давялося і гаспадару ў гэткае пекла падымацца. А за ім і іншыя касцы падняліся. Кулак першы пайшоў, а парабак за ім, ды так хутка ідзе, ледзь на пяткі гаспадару не наступае. Пачаў прасіцца кулак:

— Не спяшайся ты так, Йонас, а то мне яшчэ пяткі абрэжаш!

А парабак усё не сунімаецца. Азірнуўся гаспадар, а Йонас і траву нават не кранае, толькі касавільнам размахвае.

— Што гэта ты, Йонас? — пытаецца гаспадар.

— Памахаем косамі, гаспадар, пакуль усе працуюць, — кажа парабак. — Няхай людзі думаюць, што і мы косім.

Гісторыя пра вёску Бандары

Праўдападобна ў 70-я гады XVIII стагоддзя на правым беразе ракі Нарвы, па рэкамендацыі двара ў Ялоўцы, пасяліліся некалькі бондараў. Займаліся вырабам посуду, пераважна з дубовых клёпак. Гэтыя вырабы двор пасылаў рэчкай Нарвай у Мазовію, дзе знаходзілася шмат пакупнікоў. Ад занятку людзей паходзіць назва вёскі Бандары.

У 1859 годзе ў Бандарах жыло 5 сем'яў і ўсе, апрача апрацоўкі зямлі, займаліся бондарствам. Паводле перапісу Ялоўскага староства, у 1857 годзе у Бандарах пражывала 56 чалавек. У выніку тыфу і халеры, якія прыйшлі сюды ў 1855-1860 гг. у вёсцы засталіся 33 асобы. Аднак, у наступных гадах, колькасць жыхароў павялічылася і ў 1938 годзе жыло тут 89 чалавек.

Ад 1927 года Бандары былі вядомыя ў наваколлі працай млына, які належаў Міхалу Буру. У 1968 годзе млын згарэў.

У час нямецкай акупацыі праз Бандары пралягаў шлях, якім пераходзілі з Белавежскай пушчы ў Кнышынскую партызаны. З 1977 года пачалі будаваць вадасховішча „Семяноўка" і колькасць жыхароў павялічылася. У пачатку 80-х гадоў тут пачалі ўзводзіць 9 жылых корпусаў, у якіх пасяліліся людзі з затопленых вёсак.

Прывабнае месцараспалажэнне Бандароў гэта прычына, дзеля якой людзі з гарадоў купляюць тут зямельныя ўчасткі і старыя гаспадаркі. Гэтае месца асабліва моцна спадабалася жыхарам сталіцы, якія ахвотна карыстаюцца чыстым паветрам.

Звесткі сабраў Мацей Багнюк, вучань V „б" кл. у Нараўцы

* * *

Зусім іншую інфармацыю пра Бандары запісала Моніка БАРАН з V „б" класа.

Даўно-даўно каралевай Польшчы была Бона, вядомая тым, што сваіх падданых любіла абдароўваць прывілеямі за вылучэнні ў нейкай справе. Яна вельмі любіла прыроду, асабліва пушчанскія тэрыторыі, якія з вялікай ахвотай наведвала разам са сваёй дружынай. Вёскі Бандары яшчэ ў той час не было, пражывалі тут нешматлікія людзі. Аднойчы гандлёвым шляхам, які праходзіў побач сённяшняй вёскі, ехала каралева. У час навальніцы яна затрымалася тут на начлег. Людзі прынялі яе вельмі шчыра і абдаравалі рэгіянальнымі падарункамі. Каралева захаплялася ткацкімі вырабамі, бортніцтвам, а таксама арыгінальным будаўніцтвам з народным арнаментам. На развітанне каралева пакінула жанчынам дэкаратыўныя запінкі, а мужчынам — лукі, нажы і адзенне. На памяць гэтай незвычайнай падзеі людзі назвалі сваю мясцовасць Бандары — ад дараў Боны. Назва вёскі засталася па сённяшні дзень.

Ад рэдакцыі: Легенда пра каралеву Бону моцна распаўсюджаная. Сустракаем яе там, дзе першы член назвы пачынаецца на „Бон". Больш верагодная першая версія, тым больш, што ў наваколлі шмат вёсак, якія сваю назву ўзялі ад прафесій — Рыбакі, Гарбары, Рудня, Буды.

Маленькі коцік

Сядзеў коцік пад сталом,
Ён збіраў акрошкі.
Мой ты коцік, дзе ж ты быў?
Я ж рабіў за служку.

Залез коцік сам на стол,
Пагасціўся трошкі.
Ты маленькі негадзяй
Не табе пірожкі!

Скочыў ён хутчэй назад,
Аблізаў свой носік.
Пабег хуценька ў сад,
Паганяць свой хвосцік.

Мушка-цыкатушка

Малая мушка-цыкатушка,
Вельмі хітрая была.
Яна хуценька, як птушка,
Падляцела да стала.

На стале былі сяброўкі,
Усім хочацца яды.
У мушкі вочкі разышліся,
Ад такое грамады.

Прыйшоў хлопчык, хоць маленькі,
Хутка бітку ён узяў.
Мушка скочыла на сценку,
Аб другіх і след прапаў.

Малы Крысціян

Малы Крысціян, ён акцёр,
Сказку хутка вывучае.
Кіруе ёю, як шафёр,
Ніякіх клопатаў не мае.

Як вершык выйдзе расказаць,
Усіх людзей захопіць.
Публіку б хацеў заваяваць,
Так умела гэта робіць.

Песню так ён заспявае,
Ажно сценкі задрыжаць,
Мала хто яму зраўняе,
Не ўсе ўмеюць так выступаць.

Эвеліна Бурнос

(Вершы Эвеліны былі вылучаны ў Конкурсе беларускай паэзіі і прозы.)

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Крыстыян і Эвеліна Бурносы з татам

Чаму хмаркі плачуць

Калісьці Хмаркі і Сонца моцна сябравалі. Бывала, сустрэнуцца, а Сонца і кажа:

— Давайце гуляць у жмуркі.

Гуляюць у жмуркі, пакуль не надакучыць. Тады Хмаркі сваю гульню прапаноўваюць:

— А цяпер давай у класы пагуляем...

Дружна, згодна жылі Хмаркі і Сонца. Але аднаго разу Хмаркам надакучыла і ў класы, і ў жмуркі гуляць. Прыдумалі яны новую гульню — дражнілкі. І кажуць Сонцу:

— Давай у дражнілкі пагуляем.

— Не ўмею я ў дражнілкі, — адмаўляецца Сонца.

— Ды гэта ж вельмі проста. Вось паслухай:

Сонца свеціць,
Сонца грэе,
Сонца — гэта батарэя.

— Я не батарэя, — нахмурылася Сонца. — Я проста Сонца.

— Рыжае ты! — пацяшаюцца Хмаркі.

— Залатое я, а не рыжае.

— Рыжае! Рыжае! — дражняцца Хмаркі. Пакрыўдзілася Сонца і схавалася ў сваю хатку.

Хмаркі, трохі пагуляўшы, таксама дамоў паплылі. Спадабалася Хмаркам новая гульня. Назаўтра, як толькі выглянула Сонца, яны зноў тут як тут.

— Давай у дражнілкі пагуляем!

— Хопіць з мяне і ўчарашніх дражнілак, — сказала Сонца і ў хатку паплыло.

Доўга Хмаркі чакалі, пакуль выйдзе Сонца, але так і не дачакаліся. Не ведаюць, што і рабіць. Няма з кім пагуляць, няма з кім пацешыцца. Крыўдна стала. Гэтак крыўдна, што не вытрываць. І заплакалі горка-горка...

З таго часу так і павялося: толькі выплывуць Хмаркі на неба — Сонца адразу ж у хатку хаваецца. А Хмаркі плачуць.

Аляксей Якімовіч

Уладзімір АРЛОЎ, Адкуль наш род

Францішак Багушэвіч

У расстанні з Беларуссю

У сутычцы з царскімі карнікамі Багушэвіч быў паранены. Яму ўдалося ўратавацца ад астрожнай камеры і кайданоў. Але за гэта Францішак заплаціў доўгімі гадамі жыцця далёка ад роднай зямлі.

Былы паўстанец быў добрым канспіратарам. Ён пераехаў на Украіну і скончыў там юрыдычны ліцэй. Пасля гэтага Багушэвіч доўга працаваў судовым следчым на Украіне і ў Расіі.

Ён раскрыў шмат злачынстваў і дапамог многім людзям. Францішка паважалі, ён меў добрых сяброў і прыяцеляў.

Але сэрца клікала яго туды, дзе жыў ягоны народ, дзе гучала багатая і мілагучная беларуская мова, якую расійскія чыноўнікі называлі „мужыцкай" і „хамскай".

Зноў прайсці па дарагіх яму з юнацтва віленскіх вуліцах Багушэвіч змог толькі праз дваццаць гадоў.

Мужыцкі адвакат

Вярнуўшыся на Бацькаўшчыну, Францішак Багушэвіч уладкаваўся ў Вільні на пасаду адваката ў акруговым судзе. Адвакаты займаліся абаронаю абвінавачаных і пацярпелых. Багушэвіч заўсёды найперш браўся за справы сялянаў і гарадскіх беднякоў. Простыя людзі паважалі яго і за тое, што з беларусамі ён заўсёды гаварыў па-беларуску.

Жыхары Вільні ды навакольных вёсак і мястэчкаў з любоўю называлі Францішка Багушэвіча „мужыцкім адвакатам". Аднак яшчэ амаль ніхто не ведаў, што ён не толькі абараняў беларусаў у судах, але і складаў на беларускай мове вершы.

(працяг будзе)

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Пастаноўка твора „Белы вянок”

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Пастаноўка „Заручыны”

Жывое беларускае слова

У конкурсе „Сцэнічнае слова”, які 14 красавіка адбыўся ў Бельскім доме культуры, прынялі ўдзел 20 дэкламатараў і дзве тэатральныя групы з Гайнаўскага і Бельскага белліцэяў. Вучаніца Гайнаўскага ліцэя Наталля Зофія Лемеш выступіла ў спектаклі аднаго акцёра.

Вучні дэкламавалі па адным вершы і фрагменце прозы. Часта карысталіся творчасцю „белавежцаў” і эміграцыйных пісьменнікаў.

— Добра, што моладзь хоча гуляць у тэатр і жывое слова. Узровень дэкламацыі не быў надта высокі, сустракалася няправільнае вымаўленне. Моладзь сярэдніх школ павінна адчуваць настрой дэкламаваных твораў, што не заўсёды наглядалася. Аднак перад некаторымі вучнямі ёсць тэатральная будучыня, — заявіла старшыня конкурснай камісіі Тамара Русачык.

У дэкламатарскім конкурсе першае месца занялі вучаніцы Бельскага белліцэя Эмілія Шымчук і Кацярына Нікіцюк. Другое месца занялі Малгажата Карпюк з Гайнаўкі і Міраслава Леанюк з Бельска. Трэцімі месцамі надзялілі Дароту Нікалаюк з Бельска і Дануту Шпілько з Гайнаўкі. Вылучэнні атрымалі Анна Ляшчук з Гайнаўкі і Анна Паўлючук з Бельска. За пастаноўку „Белага вянка” Уладзіслава Галубка гайнаўская тэатральная група з пяці асоб, якой апекаваўся настаўнік Ян Карчэўскі, атрымала першае месца. Другое месца занялі вучні Бельскага белліцэя, якія падрыхтавалі пастаноўку „Заручыны”. Апекуном іх была настаўніца беларускай мовы Анна Бжазоўская. За пошукі новых тэатральных форм Наталля Зофія Лемеш атрымала вылучэнне. За выдатную акцёрскую ігру ў тэатральных прадстаўленнях вылучаны былі Эльвіра Пліс з Гайнаўкі і Марта Вайшковіч з Бельска.

— Гайнаўскія ліцэісты паказалі больш акцёрскую ігру, чым бельскія. Аднак вучні з Бельскага ліцэя падрыхтавалі цікавейшае сцэнічнае афармленне, — паінфармавала член камісіі Яніна Плютовіч з БДК.

Узнагароды пераможцам уручылі старшыня Галоўнага праўлення БГКТ Ян Сычэўскі і сакратар ГП Валянціна Ласкевіч. У час конкурсных змаганняў прысутны быў візітатар Падляшскай куратoрыі Тамаш Чарнэцкі.

Аляксей Мароз

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Пераможцы конкурсу: (злева) Эмілія Шымчук, Кацярына Нікіцюк, Малгажата Карпюк, Міраслава Леанюк, Дарота Нікалаюк, Данута Шпілько, Анна Ляшчук, Анна Паўлючук, Наталля Лемеш, Эльвіра Пліс і Марта Вайшковіч

Падзяка за памяць

14 сакавіка ў Беларускім музеі ў Гайнаўцы адкрылася выстава прац народнага мастака Беларусі Васіля Шаранговіча. Арганізавалася яна пры выдатнай дапамозе Пасольства Рэспублікі Беларусь у Варшаве і Генеральнага консульства РБ у Беластоку. Мерапрыемства сабрала ў мурах музея беларускіх дзеячаў Гайнаўшчыны. На жаль, па стане задароўя на вернісажы не мог прысутнічаць Канстанцін Майсеня — заснавальнік і шматгадовы старшыня Грамадскага камітэта пабудовы Беларускага музея.

Прафесар Васіль Шаранговіч падарыў Канстанціну Майсеню манаграфію-каталог сваёй графікі. У той самы дзень перадаў я кніжны падарунак з аўтографам мастака ганароваму старшыні Грамадскага камітэта пабудовы Беларускага музея.

Кастусь Майсеня разам з жонкай Анастасіяй шчыра дзякуюць беларускім дыпламатам за памяць, асабліва за запрашэнне на адкрыццё выставы і цёплыя, сардэчныя велікодныя віншаванні.

— Шчыра дзякую таксама прафесару Васілю Шаранговічу за альбом з ягонымі працамі. Жадаю яму моцнага здароўя і далейшых творчых поспехаў у працы на ніве беларускай культуры, — сказаў Канстанцін Майсеня.

Трэба з радасцю дадаць, што цяпер стан здароўя Канстанціна Майсені папраўляецца і з кожным днём адчувае ён сябе штораз лепш. Жадаю яму здароўя.

Віктар Бура

Фільмавы вечар

Майскі доўгі уік-энд, якога чакаем з вялікай радасцю, для большасці з нас будзе часам адпачынку ад штодзённых турбот. Я на гэтыя выхадныя дні прапаную чатыры фільмы.

„Гісторыя кахання” (*Decalage Horaire*) — французская навінка ў рэжысуры Даніэля Томпсана з Жульет Бінош і Жанам Рэно ў галоўных ролях — гэта прапанова для аматараў рамантычных камедый.

Галоўныя героі — Філіп і Роса — спатыкаюцца на аэрадроме ў Парыжы, дзе па прычыне ўсеагульнай забастоўкі работнікаў стрыманы рух.

Ён — замкнуты ў сабе кухар, вярнуўшыся з ЗША рашаецца адкрыць рэстаран і знайсці жанчыну сваіх мараў. Яна — спантанная і размоўная касметолаг, уцякае перад сваім любоўнікам. Лёс сутыкае іх з сабою і ствараецца дуэт, які пакажа чым ёсць сапраўдная любоў.

„Макракосмас” прадстаўляе жыццё птушак у падарожжах. Аператары фільма выкарыстоўваюць усе даступныя сродкі, каб у гледача склалася ўражанне прысутнасці ў дзеянні! Часам здаецца, што ляцім разам з дзікімі гусямі, чуем іх галасы, трапятанне крылаў, шум вады. Бачым дзікія гусі, якія пралятаюць тры тысячы кіламетраў без перапынку, праходзячы ў гэтым часе вялікія снегапады, пустынныя буры, дажджы над акіянам...

„Як пазбыцца хлопца за 10 дзён” (*How to Lose a Guy in 10 Days*) аўтарства Дональда Пэтры — гэта рамантычная камедыя, якая перанясе нас у свет вялікага горада, дзе ажыццяўляюцца ўсе мары.

Маладая журналістка з жаночага даведніка — Эндзі (Кейт Хадсан) мае за заданне напісаць артыкул — перасцярогу аб тым, як нельга паводзіць сябе з мужчынамі. Дзяўчына спатыкае прыстойнага Бэна (Мэцью Мак Конахі) — працаўніка рэкламнага агенцтва, які прымушаны даказаць свайму шэфу, што ў тым самым часе здабудзе жанчыну, каб затрымаць кліента з вялікай ювелірнай фірмы. Маладыя людзі пачынаюць новы этап у сваім жыцці з хлусні, але ці гэта можа стрымаць сапраўдныя пачуцці? Адказ знойдзеце ў кіно!

На канец „Аб Шміце” (*About Schmidt*) у рэжысуры Аляксандра Пэйна з Джэкам Нікальсанам у галоўнай ролі. Фільм прадстаўляе гісторыю новаспечанага пенсіянера, які не патрапіць апынуцца ў новай рэчаіснасці, замыкаецца перад усімі, а калі памірае яго жонка, здаецца яму, што гэта ўжо канец.

Усё змяняецца, калі адкрывае, што дваццаць гадоў таму жонка мела раман з ягоным сябрам. Гнеў выклікае патрэбу змены і Уорэн Шміт пастанаўляе выбрацца ў падарожжа. Прычынай для гэтага паслужыць спатканне з дачкой (Хоўн Левіс), якая мае выйсці замуж за неадпаведнага, на яго погляд, мужчыну. Папраўдзе Уорэн Шміт хоча зрабіць падрахунак свайго жыцця, але сітуацыі, у якіх часта знаходзіцца, лагодзяць сур'ёзнасць фільма і гледачы ад слёз пераходзяць да смеху. А Джэк Нікальсан пацвярджае зноў сваё майстэрства і таму варта выбрацца ў кіно!

Паўліна Шафран

Гарцэрства на Гайнаўшчыне

У Гайнаўцы першая гарцэрская дружына была заснавана ў 1923 годзе. У 1956-1990 гадах у Гайнаўцы было Аддзяленне ЗГП. У павеце існавала шмат гарцэрскіх атрадаў. У 1990 годзе ўся іх дзейнасць заняпала. Не стала зухавых гуртоў, ні гарцэрскіх атрадаў, адышлі інструктары ЗГП.

Летам у 2002 годзе невялікая група прыхільнікаў скаўтынгу зноў пачала гарцэрскую выхаваўчую працу ў Гайнаўскім павеце. Моладзь пачала надзяваць гарцэрскія уніформы.

Зараз у Павятовым саюзе атрадаў ЗГП грамадска працуе 7 інструктараў ды 90 гарцэраў і зухаў. Сядзіба ЗГП змяшчаецца па вуліцы Ю. Пілсудскага 10а. Тут працуе камендантка Павятовага саюза атрадаў Марыёля Тэрэсяк. Намерана яна арганізаваць, між іншым, гарцэрскі лагер улетку. Шукае спонсараў дзеля таго, каб купіць палаткі, пледы, пасцельныя камплекты, спальныя мяшкі, кацялкі і іншыя прылады. (яц)

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Колішняя пясочная вырабатка ў Орлі, дзе ў 70-х гадах была футбольная пляцоўка, сёння зарастае бярэзнікам

Што зберагае Арлянская зямля

У рамках геалагічнага вопісу залежаў мінеральных сыравін, праведзенага на Беласточчыне ў 1992 годзе, у Арлянскай гміне ўстаноўлена залежы гліны для керамічных мэтаў. Выкапні ў Антанове, аб'ём якіх расцэньваўся на 1 465 тыс. кубаметраў, сёння зрасходаваны, бо да 1974 года працавала тут цагельня. Залежы Орля, у напрамку Рудутаў, аб'ём якіх расцэньваецца на 2 253 тыс. кубаметраў, зберагаюць гліну прыгодную для столевых і сценных пустацелых цэглаў, дрэнажных трубак і кафлі. Прапанаваная арлянамі ў 1985 годзе пабудова там керамічнага завода не здзейснілася, бо сталічныя планавікі не справіліся ў пару з канцэпцыяй і прадбачваны Орлі крэдыт трапіў у іншае месца. На поўнач ад гэтых залежаў устаноўлена асадкі пяску і гліны.

Каля Кошак залягаюць дробназярністыя пяскі, а каля Алекшаў і Дыдуль асадкі гліны і пяску. Каля Рыгораўцаў таксама ёсць асадкі пяску, аднак гэтыя залежы палічана неперспектыўнымі і спынена далейшае іх расследаванне. Буйнапясочныя пароды выступаюць у паўднёвай частцы гміны ў форме гнёздаў, лінзаў і ледавіковых пластоў, аднак у іх бываюць прымесі гліны, руды і пылу. Большыя вырабаткі гэтай сыравіны распаложаны каля вёсак Дыдулі, Малінікі, Вулька-Выгаеўская і Паўлінова. Апошнія вырабаткі на тэрыторыі гміны маюць мясцовае значэнне і выкарыстоўваюцца непастаянна. У паўночнай і цэнтральнай частцы гміны гэтая сыравіна не выступае. Буйнейшыя добраякасныя пясочныя вырабаткі ёсць каля Шчытоў-Навадвораў і Орлі, апошнія маюць адно мясцовае значэнне. 16 пясочных вырабатак прапануецца рэкультываваць з прычыны вычарпання залежаў і дрэннай якасці астаткаў.

Аналіз геалагічнага матэрыялу паказаў, што на тэрыторыі гміны няма буйнапясочных і крэйдавых залежаў прыгодных для прамысловага выкарыстання, затое ёсць меншыя каля Маліннік і Вулькі-Выгаеўскай (па 25 тыс. кубаметраў). Такія ж залежы гліністых парод выступаюць каля Міклашоў і Крывятыч.

* * *

Арлянскія гмінныя ўлады, нягледзячы на пастаянную патрэбу жвіру для дарожнага будаўніцтва, не хадайнічалі за запуск уласнай жвіроўні і яе легалізацыю. У снежні 1996 г. і ліпені 1997 г. тадышні старшыня Гміннай рады нелегальна прадаў гміне жвір з уласных палеткаў. Група арлянскіх радных паведаміла пра гэта органы аховы асяроддзя ў Беластоку і за здабычу пароды без законнай канцэсіі старшыня атрымаў грашовы штраф.

У маі 1999 года на аснове рашэння тагачасных гмінных улад жвір выбіралі з нелегальнай вырабаткі каля Вулькі-Выгаеўскай і такім чынам свядома знішчылі частку старых могілак, а людскія косці траплялі на будову дарог. У выніку майго, раднага, хадайніцтва некалькі разоў займаўся справай ваяводскі захавальнік помнікаў даўніны і дзякуючы гэтаму было спынена далейшае руйнаванне могілак.

Дагэтуль арлянская Гмінная ўправа не мае ўласнай, гміннай жвіроўні. Такім чынам калі трэба рамантаваць або будаваць дарогу, падаткаплацельшчыкі нашай даволі беднай гміны дадаткова плацяць за чужы жвір.

Міхал Мінцэвіч

Цяпер усё не тое!

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

У Вялікія Азяраны публічны транспарт не ездзіць і калі хто не катаецца на сваёй машыне, тады трэба туды часаць на сваіх дваіх ад шашы з Крынак у Крушыняны. Іду з Крушынян, у дарозе насцігаю бабульку, жыхарку Ласінян, якая вяртаецца дамоў з гмінных Крынак. Дарога пралягае праз маладыя пасадкі і аблагі; згаворваемся пра іх. Мая спадарожніца цёпла ўспамінае геркаўскі час, калі аблагоў не было, а зямлю, якую пакінулі жыхары тамашніх вёсак, абрабляў пэгээр. Бабулька мяркуе, што тады пэгээру аплачвалася абрабляць тую зямлю, але калі я перапытваю, чаму не аплачвалася яе абрабляць пакідаючым яе ўласнікам, не даведваюся адказу.

Ад Ласінян да Вялікіх Азяран рашучая перавага аблагоў над пасадкамі, краявід нічым не закрыты і можна яшчэ палюбавацца пышнай прасторай бугаркаватай Сакольшчыны, абняць вокам не толькі нашу Усходнюю сцяну, але і закінуць позірк у Беларусь, на ўсходнія схілы даліны гранічнай ракі Свіслач.

Перад вёскай працуе трактар, раскідае гной — гэта тамашні солтыс сонечныя першыя красавіцкія дні скарыстоўвае для павышэння ўраджайнасці свайго поля. Паколькі ён заняты працай, распытваць пра ягоныя Вялікія Азяраны накіроўвае мяне да суседзяў.

Дзве мажнаватыя жанчыны ахвотна панаракалі мне. Сёння ў Вялікіх Азяранах пражывае за трыццаць душ — наймалодшай, солтысавай дачцэ, дваццаць гадоў. А калісь у вёсцы было тых душ мо з трыста — хата пры хаце стаяла. Але многа вясковай зямлі асталося за граніцай; сёння з зямлі жыве ў вёсцы толькі траіх гаспадароў. І многа ў вёсцы кавалераў — вось каб так дзяўчатам у якую газету напісаць...

Малако трэба вазіць у Клябанаўцы, гэта сем-восем кіламетраў. Трымаеш тут у халадзільніку, а завязеш туды, уложаць тэрмометр у малако, а яно там зацёплае — і дахаты! І свіням тое малако трэба аддаваць. Не аплачваецца — будзем дабіваць жывёлу. Няма ніякага даходу — калі б не рэнта, то паздыхалі б.

Пры камуне плацілі не толькі за самое малако, але яшчэ і за кіламетры, што давозілі. Жылі не толькі з малака, але і фасолі па дзве-тры тоны прадавалі.

У Вялікіх Азяранах зліквідавана каля пяцідзесяці хат. Калісь хата пры хаце стаяла, і спевы былі, і танцы, і гармонік іграў. А цяпер пракляты тэлевізар выканчвае людзей.

Калісь пасцілі: у Вялікі пост ні мяса, ні яйка, ні малака нельга было есці. А сёння — мяса жарэ і яго жарэ! Усіх дзяцей былі забіралі ў царкву — на вокнах сядзелі. І як далі яйка рана, то насілі яго аж да вечара — так даражылі. І чакалася свята, бо мо новыя туфлі купяць ці што. А цяпер усё не тое!..

Пасадку пасадзілі, то ўсё дзікі зрылі. Столькі грошай і працы яна нам каштавала. І невядома, як тыя дрэўкі адкапаць — кашулю на смерць хіба трэба браць з сабою. На выгане, дзе калісь каровы хадзілі, альшына парасла і ў ёй дзікі водзяцца, лагавіска там маюць. Ніхто іх не палохае ды і лесніки не спяшаюцца глядзець тое, каб кампенсаваць страты.

Бацюшка мо сем разоў у год прыязджае ў нашу вёску, каля каплічкі моліцца. Калісь, калі не было граніцы, на Іардан прыязджаў, крыж у лёдзе вырэзвалі.

Крамы аб'язныя прыязджаюць: з Крынак тры разы ў тыдзень, з Саколкі — два і з Беластока — два разы. І свежыя, і добрыя прадукты прывозяць. А беларусы гарэлку, папяросы і паліва пастаўляюць. Кожны Божы дзень высыпаюцца сюды з Баброўнікаў, як грыбы...

Аляксандр Вярбіцкі

Мая маленькая радзіма

Вёска Вычулкі, што ўшчыльную прытулілася да мяжы з Беларуссю, — месца, дзе нарадзілася я, дзе годна жылі мае продкі, дзе многія з іх знайшлі свой апошні прытулак. Часта чула ад мамы настальгічныя аповеды аб тутэйшых мясцінах і аб людзях, што жывуць тут, — суседзях (колішніх), сваяках, сябрах. Назаўсёды ў памяці засталіся і назвы населеных пунктаў: Зубачы, Клюковічы, Нурэц, Сямятычы...

Даўно марыла я пабываць тут, паглядзець на мясціны, дзе некалі стаялі хаты дзеда Антона Сахарчука, вясковага краўца, які ўмела шыў шынялі і кажухі, касцюмы і паліто, і дзеда па бацьку — Сахарчука Дзяніса — знакамітага вясковага пісара, почырку якога зайздрошчу і сёння.

У далёкім 1946-м мой бацька Сяргей Дзянісавіч Міткевіч (такое прозвішча далі яму ў царкве) разам з жонкай Вольгай Антонаўнай і дзвюма дачушкамі ў пошуках шчаслівага жыцця едзе ў Беларусь. Пасялілася сям'я ў Брэсце, дзе бацька адразу ж уладкаваўся шафёрам у адну з будаўнічых арганізацый. (Дарэчы, вадзіць машыну ён вывучыўся ў польскай арміі, куды быў прызваны перад вайной. Служыў на Памор'і).

Разам з нашай сям'ёй на Беларусь рушылі і бацькі мамы. Спыніліся яны ў вёсцы Кавалікі, што побач з Высокім і пражылі тут да канца свайго зямнога жыцця.

Едучы паволі па Вычулках, заўважала я цікаўныя позіркі вяскоўцаў (у той час машына з беларускімі нумарамі была тут у навіну).

У сярэдзіне вёскі нас затрымалі польскія пагранічнікі. Пацікавіліся, куды трымаем накірунак, што нас тут цікавіць, праверылі дакументы. Прачытаўшы ў маім пашпарце запіс „месца нараджэння — Польшча, вёска Вычулкі", пажадалі шчаслівых сустрэч і плённага падарожжа.

За час нашай з імі гутаркі самыя цікаўныя з жыхароў павыходзілі з хат і наблізіліся да нас. Даведаўшыся, хто мы і адкуль, наперабой пачалі распытваць пра бацькоў, запрашаць на каву. Каб не пакрыўдзіць усіх, адмовіліся мы ад запрашэнняў, бо мусілі ў першую чаргу наведаць колішняга мамінага аднакласніка, былога настаўніка — Канстанціна Пытлюка.

Засталі мы яго за прыемным заняткам — абрываў даспелыя гронкі чарэшняў. Узрадаваўшыся нечаканым візіцёрам, запрасіў у хату, дзе прыветлівая гаспадыня адразу пачала завіхацца ля стала.

Я прывезла з сабой доўгі спіс прозвішчаў людзей, аб якіх павінна была распытаць гаспадара: дзе жывуць і як, кім сталі і якіх дасягнулі вышынь у жыцці. Запісаўшы дакладна атрыманую інфармацыю, яшчэ доўга не маглі мы пакінуць гасцінных гаспадароў.

Едучы дамоў, уяўляла я, як узрадуецца мама, пачуўшы мой расказ.

Яна і сапраўды быццам пабывала ў вёсцы, дзе нарадзілася і пражыла 21 год, дзе нарадзіліся яе дзеці (я і малодшая мая сястра Нона), дзе нарадзіліся і знайшлі свой спачын шматлікія продкі, якіх узгадавала і прыняла гасцінная зямелька Беласточчыны.

Тамара Лаўрэнчук

Жыццё адданае правам чалавека

Мінула ўжо больш за месяц з дня заўчаснай смерці вядомага праваабаронцы Сяргея Абадоўскага. Час ляціць няўмольна, але памяць аб гэтым чалавеку засталася назаўсёды.

Імя Абадоўскага вядомае не толькі ў яго родным Магілёве — горадзе на ўсходзе Беларусі, дзе Сяргей 52 гады таму нарадзіўся, дзе ён вырас, атрымаў адукацыю, выгадаваў чацвярых дзяцей і працаваў. Не меншую вядомасць ягонае імя набыло тут у Беластоку — горадзе, у якім ён бачыў дэмакратычную будучыню роднага краю, часцяком прыязджаючы сюды.

Пачатак 1990-х гадоў для Беларусі быў характэрны ўздымам грамадска-палітычнай актыўнасці. Не абмінулі гэтыя працэсы і Сяргея Абадоўскага, працаваўшага ў той час на магілёўскім заводзе „Строммашына". Непрыманне прагніўшых парадкаў камандна-адміністрацыйнага кіравання вымусіла яго парваць з камуністычнай партыяй. Праз некаторы час, ужо працуючы ў адным з магілёўскіх атэльле па рамонце тэлеапаратуры, ягонымі намаганнямі была створана там суполка Свабоднага прафсаюза — арганізацыі працоўнага люду, якія не жадалі быць „прывадными рамянямі" КПСС, а патрабавалі павагі да іх правоў і працы.

Актыўная прафсаюзная дзейнасць робіць з Сяргея яскравую асобу, якая ўсё больш і больш прыцягвае людзей. І гэта не выпадкова, бо на рахунку Магілёўскай абласной рэгіянальнай арганізацыі, якую першым і на доўгі час узначальвае Абадоўскі, з'яўляюцца рэальныя вынікі працы — перш за ўсё прававая дапамога сваім сябрам у разнастайных працоўных спрэчках і перамогі ў судах. Не адзін чалавек, дзякуючы намаганням Свабоднага прафсаюза, быў адноўлены на працы, пазбаўлены несправядлівага спагнання, атрымаў незаконна ўтрыманныя адміністрацыяй прадпрыемства грошы.

У той час і адбываецца знаёмства Сяргея Абадоўскага з кіраўніцтвам беластоцкай структуры прафсаюза Салідарнасць, у прыватнасці, з сённяшнім яе мясцовым лідэрам Юзэфам Мазалеўскім. Па яго словах, Сяргей быў чалавекам выключным. І сапраўды, акрамя непасрэдна прафсаюзнага супрацоўніцтва, што ўсталявалася паміж іхнімі арганізацыямі ў многім дзякуючы актыўнасці Абадоўскага, не менш плённым быў і вынік узаемадзеяння ў аздараўленні дзяцей з забруджаных рэгіёнаў Магілёўшчыны. На працягу трох гадоў медыцынскае абследаванне і адпачынак у чыстых ад радыяцыі мясцінах Падляшша прайшла не адна сотня малых грамадзян Беларусі. Для многіх беластачан, не звязаных з прафсаюзнай дзейнасцю, у тым ліку і мясцовым беларусам, Сяргей Абадоўскі запомніўся менавіта сваёй руплівасцю ў высакароднай справе аздараўлення пакрыўджаных лёсам „чарнобыльскіх" дзяцей.

Але асноўным зацікаўленнем Абадоўскага на працягу амаль усіх 1990-х гадоў застаецца прафсаюзная праца. Унутрыпалітычныя абставіны Беларусі прыводзяць да таго, што дзейнасць у дэмакратычных прафсаюзах найшчыльнейшым чынам мяжуе з палітычнай і праваабарончай дзейнасцю. Палітыка не абмінае і Сяргея. У 1999 годзе падчас наладжаных апазіцыяй прэзідэнцкіх выбараў, што мусілі адбыцца згодна з нязмененай Канстытуцыяй 1994 года, Абадоўскі становіцца каардынатарам гэтых выбараў па Магілёўскай вобласці. Яго імя ўсё больш і гучней чуваць на абшары ўсёй Беларусі, а таксама за яе межамі.

Асобным яркім штрыхом біяграфіі Абадоўскага як праваабаронцы з'яўляецца арганізацыя і функцыянаванне Магілёўскага праваабарончага цэнтра (МПЦ) — дагэтуль існуючай адзінай рэгіянальнай арганізацыяй падобнага кшталту. У прафсаюзах, у тым ліку і ў Беластоку, з разуменнем паставіліся да факту сыходу Абадоўскага з пасады прафсаюзнага лідэра цэлага рэгіёна. Кажучы словамі таго ж Юзэфа Мазалеўскага, прыходзіць час, калі лідэр адчувае — прафсаюзны касцюм стаў яму замалы і чалавек робіць выснову аб тым, што зрабіў для арганізацыі на яе чале ўсё, што мог і трэба даць дарогу іншым.

Самай адметнай рысай характару Сяргея было хваляванне патрэбамі навакольных людзей у значна большай ступені чым уласнымі. Гэта заўважаюць і тут, у Беластоку, не толькі сябры з Салідарнасці, але і прадстаўнікі мясцовых беларускіх арганізацый. У прыватнасці, у тыднёвіку „Ніва", дзе пра яго неаднаразова пісалі, а ён, у сваю чаргу, цікавіўся справамі меншасці, выпісваючы газету да сябе ў далёкі Магілёў.

Актыўнасць праваабаронцы і дэмакрата не даспадобы прыходзіцца шмат каму з трымаючых уладу. Неаднаразовыя затрыманні і суды супраць яго самога, арышты і грашовыя штрафы, пераслед членаў сям'і (ягоны сын Іван стаў палітычным уцекачом і зараз жыве ў Беластоку) маглі б зламаць каго заўгодна. Але Сяргей трымаўся, верачы ў правату сваёй справы.

Праваабарончая дзейнасць і як дырэктара МПЦ, так і актывіста Беларускага Хельсінскага камітэта робіць з Абадоўскага сапраўднага высокакваліфікаванага юрыста-практыка. У наладжаную грамадскую праваабарончую прыёмную прыходзяць параіцца тысячы чалавек. Але разуменне неабходнасці пастаяннага ўдасканалення штурхае да набыцця ведаў. Заканчэнне Магілёўскага Інстытута правазнаўства ўзмацняе яго тэарэтычную дасведчанасць. У галіне абароны правоў чалавека ў родным горадзе Сяргея Абадоўскага яму не стае роўных. Сяргей вучыцца сам і навучае іншых. Бясконцая колькасць семінараў, лекцый, выступаў спрыяюць ягонай вядомасці і за межамі Беларусі. Адной з яскравых старонак праваабарончага супрацоўніцтва з замежжам становяцца стасункі з Польскім фондам правоў чалавека. Сяргей запрашаецца і з задавальненнем вучыцца на наладжаных гэтай арганізацыяй Вышэйшых міжнародных курсах па абароне правоў чалавека, якія, на жаль, яму скончыць было не наканавана.

Заўчасная смерць была як перарваны палёт птушкі, якая што ёсць моцы ірвалася ў вышыню. Але нават незавершаны палёт не стаў дарэмным, бо ў тую вышыню пацягнуліся іншыя — для каго свабода Беларусі, дэмакратыя і правы чалавека не пустыя гукі і для каго гэтыя паняцці найшчыльнейшым чынам звязаныя з дзейнасцю Сяргея Абадоўскага.

Імя С. Абадоўскага нададзена Магілёўскаму праваабарончаму цэнтру.

Уладзімір Лапцэвіч

Лічылася выдатніцай

Расказвае 81-гадовая Марыя ЕФІМЮК — жыхарка Чаромхі-Станцыі.

Нарадзілася я 1 студзеня 1922 года ў Сабятыне, Бельскага павета. У царкоўнай метрыцы запісалі аднак 1 снежня 1921 года (так, мабыць, кумы прад'явілі). Бацька Язэп Федарчук са Снежак выводзіўся, а матуля Аляксандра з Сабятына. Сям'я была вялікая. У бацькоў дзесяцёра дзетак нарадзілася, але я чатырох запамятала (апошнія памерлі). Быў старэйшы брат Мікалай з 1914 года нараджэння, Надзея — з 1917 г. і самы малодшы Янка з 1924 года (я была чацвёртая). Як былі ў бежанстве, дык бацька мой у царскай паліцыі служыў у Мінску. Як дамоў вярнуліся то бедна жылі. У бацькі адно чацвяртуха поля была. Каня не мелі. У аднавяскоўцаў прасілі, каб поле заараць. Жылі ў маленькай аднапакаёвай хатцы. Замест падлогі гліняны ток быў. На гару са спальні заходзілі. Матулі пятнаццаць дзесяцін па бацьку засталося. У бацькавага брата, значыцца, у дзядзькі, дачка была. Выхоўвалася яна пры старэнькіх апекунах. Як падрасла да паўналецця, дык апекуны ў суд заяву падалі на раздзел маёмасці. Матулі дасталася сёмая частка. Забралі нам поле і хату. Пакінулі адно цесны вузенькі куточак. Апекуны нядобразычлівымі аказаліся. Пляменніца з імі надалей жыла, а ў нашай хаце збожжа трымалі. Бацька пачаў хварэць. Аднавяскоўцы параілі, каб да сябе забраць. З прыходам саветаў новая ўлада нам хату вярнула.

У 1931 годзе мяне паслалі ў школу. У Сасінах вучылася. Як была ў другім класе, дык на заробак да Мэсенга ў Быстрыя хадзіла. Уладальнік маёнтка жыў у Варшаве. Маёмасцю ўпраўляў наглядчык. Казалі, што пан паслом у Сейме быў. Маёнтак вялікі быў. Шмат было лесу. З вялікіх ставаў жыхары вёскі кралі рыбу. Працавала я ў полі, палола агародніну ды капала бульбу. За дзень працы плацілі восемдзесят грошаў. За гэтыя грошы можна было купіць метр крэтонавага палатна. Мяне ставілі пасярэдзіне паміж дарослымі, паколькі баяліся, што наглядчык не дазволіць малалетняй працаваць.

У школе я лічылася выдатніцай. У першым класе вучылі польскай мове, рахункаў, спеваў і рысункаў. Апрача таго праводзіліся заняткі па фізкультуры. Вучылі рэлігіі. У другім класе дайшлі практыкаванні ручных работ, а ў трэцім: прырода, геаграфія, гісторыя і навука аб сучаснай Польшчы. Трэці клас я паўтарала, паколькі чацвёртага класа не было, а назначанага ўзросту я не дасягнула. Школу закончыла з кніжнай узнагародай. Выхавацелькай была Марыя Вацлавічуўна, а кіраўніком школы — Леон Мазур. Трохкласную публічную паўшэхную школу ў Сасінах я закончыла 14 чэрвеня 1933 года.

У 1946 годзе выйшла я замуж у Чаромху за Васіля Ефімюка. Мая сястра была ў Чаромсе замужам. Працавала прадаўшчыцай у краме мясніка Шміткоўскага. Швагер, Шымон Юхімовіч, працаваў машыністам на чыгунцы. Тавар з Польшчы прывозіў. Муж мой вартаўніком у ахове чыгункі служыў. Часта ў краму заходзіў. Там пазнаёміліся. Згулялі вяселле.

Васіль памёр на 61 годзе жыцця. Адна я ў Чаромсе засталася. Сын Воўка з Бельска наведвае.

Уладзімір Сідарук

Бежанцы

У час нямецкай акупацыі жыхароў прыпушчанскіх вёсак немцы вывозілі, каб не дапамагалі савецкім партызанам, а іхнія сялібы палілі і разбуралі. Помню, што летам ехаў цераз нашу вёску Бялкі абоз з жырахамі вёскі Скупава, што ў Нараўчанскай гміне. Было перад абедам, калі нямецкія салдаты-канваіры загадалі спыніцца на адпачынак. Тады адна скупаўская сям'я — якіх называлі мы бежанцамі — знайшла кватэру ў Вольгі Амельянюк, удавы з двума дзеткамі. Немец агледзеў кватэру і загадаў гаспадыні, каб добра абыходзілася з сям'ёй высяленцаў. Удава з дзеткамі жыла ў кухні, а сям'я бежанцаў у пакоі велічынёю ў 30 кв. метраў, у якім не было ні печаў, ні падлогі. Але тыя людзі былі вельмі знаходлівымі, мелі залатыя рукі да работы. Найперш пабудавалі печ, а затым палажылі падлогу.

Сям'я складалася з сямі асоб — бацькі, маці, сыноў — Цімы, Люшы, Валодзі і дочак Каці і Аляксандры. Калі сям'я ўладкавалася на новым месцы, зрабілі ножную такарню. Былі яны добрымі майстрамі па вырабе калаўроткаў. Мелі яны поўныя рукі работы і зімою, і ўлетку. Заплату бралі харчовымі прадуктамі. Потым пабудавалі яны вятрак і зрабілі ў ім прыстасаванне для зараджання акумулятараў, а ў хаце зрабілі электрычнае асвятленне. Жандармерыя з пастарунка ў Трасцянцы прывезла акумулятары для зараджэння, а Ціму, найстарэйшага сына, забралі, каб абсталяваў электрычнае святло на пастарунку ды ў канюшні, дзе спалі шуцпаліцаі. Ціма і Люша дапамагалі бацьку ў вырабе калаўроткаў і сталяркі, а Валодзя, якому было тады 10 гадоў, гуляў з намі, аднагодкамі.

За стадоламі, пры савецкай уладзе, была пабудавана 20-метровая вышка з чатырох хвояў, спалучаных вярхом і завершана двухметровым слупам, на якім былі прыбіты па тры дошачкі ў напрамках чатырох старон свету. Вышку называлі мы „выгляд". Бывала, Валодзя басяком залезе на вышку, адпачне на чатырох хвойках, а пасля ўзнімаецца наверх, а калі ўжо стане нагамі на той слуп, паглядзіць на наваколле і кажа, што адсюль Скупава не відаць. Потым плюне, а калі сліна даляціць да зямлі, тады памаленьку распранецца і кідае свой пінжачок на зямлю. Тады памаленьку злазіць з вышкі. Паўтаралася гэта амаль кожны тыдзень. Я не мог так высока ўскараскацца як Валодзя, але далазіў да месца, дзе злучаліся чатыры сасны. Хацелася пастаяць і патрымацца за слуп. Потым апускаўся на зямлю.

23 ліпеня 1944 года, якраз на святога Антонія, Чырвоная Армія вызваліла нашу вёску. Тады бацька сям'і бежанцаў паехаў роварам у Скупава. Вёска была спалена, але людзі ўжо вярталіся. Нанялі яны фурманкі, пагрузілі сваю маёмасць ды паехалі на бацькаўшчыну. Здаецца, прозвішча іх было Янюкі. Праўдападобна іхняя дачка Каця была настаўніцай у адной з гайнаўскіх школ. Ці жыве хто-небудзь з гэтай сям'і ў Скупаве ці Гайнаўцы ніхто ў нашай вёсцы не ведае.

Мікалай Лук'янюк

„Агракрэсы” запрашаюць

Ад пачатку мая да канца верасня працягваецца турыстычны сезон. А вось дык ужо і май.

У Міхалове (Беластоцкі павет) заснавалі Агратурыстычнае аб’яднанне „Агракрэсы”. Яно займае прытульны пакойчык у Гмінным цэнтры культуры, спорту і адпачынку па вуліцы Беластоцкай 19. Зараз „Агракрэсы” аб’ядноўваюць 23 агратурыстычныя гаспадаркі, якія маюць 214 начлежных месц. Яны прымаюць усё новых і новых наймальнікаў кватэр для турыстаў з усіх гмін Беластоцкага павета. Найбольш кватэранаймальнікаў у Гарадоцкай і Міхалоўскай гмінах. У іх адны з прыгажэйшых дамы, у іх лепшыя пакойчыкі для турыстаў, купальныя пакоі толькі для гасцей, самастойныя кухні для гасцей, задбаныя панадворкі з альтанкамі ды з пляцоўкамі для дзіцячых гульняў. Кватэранаймальнікі прапануюць пакарыстацца веласіпедам, байдаркамі, грылем, ляжакам (шэзлонгам). Кватэры можна наймаць на працягу ўсяго года. Толькі ў пяці выпадках кватэры здаюць у наймы ад пачатку мая да канца верасня. У гэтую пару вельмі дбаюць пра эстэтычны выгляд сялібы, пра дэкаратыўныя кустарнікі, газоны, кветнікі, элегантную агароджу.

Кватэры прапанаваныя турыстам найчасцей знаходзяцца ў прыгожых закутках Беласточчыны: недалёка ад лесу, ракі, ставу або Семяноўскага возера. Апрача таго яны блізка ад аўтобуснага або чыгуначнага прыпынку. Турысты любяць пабываць „на прыродзе” — хадзіць у лес па ягады і грыбы, некаторыя з іх рыбачаць (часта сярод іх бываюць г.зв. закалённыя вудзільшчыкі. Або — як яшчэ іншыя — ездзіць конна, вярхом.

Прыезджыя могуць захапляцца цікавай архітэктурай ды пабываць у цэрквах і касцёлах у Гарадку, Каралёвым Мосце, Мастаўлянах, Міхалове, Новай Волі, Юшкавым Грудзе, Ялоўцы і Тапалянах.

У г.зв. усходняй паласе Беласточчыны існуе веласіпедны шлях ад Каралёвага Моста ў Ялоўку. Праваднікі распавядаюць турыстам пра гісторыю паасобных мясцовасцей на гэтым шляху, раздарожжаў і крыжоў на скрыжаваннях важнейшых дарог. Многія з расказчыкаў ведаюць пра цікавыя здарэнні на гэтай тэрыторыі ў далёкім і недалёкім мінулым.

У летнім сезоне ў Гарадоцкую і Міхалоўскую гміну ахвотна прыязджаюць адпачываць турысты з Заходняй Еўропы, між іншым з Аўстрыі, Нямеччыны, Бельгіі, Францыі.

Для замежных і краёвых турыстаў улетку асяродкі культуры будуць арганізаваць розныя займальныя культурныя і спартыўныя мерапрыемствы. „Агракрэсы” падрыхтавалі ўжо загадзя каляндар турыстычных атракцыёнаў у Беластоцкім павеце ад пачатку красавіка да канца верасня гэтага года. У ім і беларускія летнія культурныя імпрэзы, між іншым, агляд абрадавых калектываў у Гарадку ў маі; Свята беларускай культуры ў Беластоку, беларускі фэст у Заблудаве і Дні Гарадка ў чэрвені; „Басовішча” ў Гарадку ў ліпені ды „Сяброўская бяседа” ў Гарадку ў жніўні.

Янка Целушэцкі

Фота Аляксандра Вярбіцкага

У пачакальні

У нашай краіне, у тым ліку і на нашых старонках, вялікія хваляванні выклікаюць прадказанні чыгуначных улад аб скарачэнні спалучэнняў. У абарону апальных ліній сцяною стаюць тады мясцовыя, асабліва самаўрадавыя, эліты. А як да гэтай справы ставяцца г.зв. народныя масы?

На ранішні поезд з Беластока ў Бельск сядаю на прыпынку Беласток-Стадыён. У першым вагоне, „пульмане”, амаль у кожным купэ асабістая спальня — людзі, відаць, едуць з начной змены. У другім вагоне, з трох адсекаў — па адной асобе ў адсеку; падобна і ў трэцім. Толькі ў адным купэ кампанія — адзін шчаслівец у ёй на ўвесь голас захапляецца выказваннямі Лепэра. У Страблі колькасць пасажыраў падвойваецца — садзіцца гаманлівая школьная моладзь і паклоннік Лепэра прыціхае.

Злажу з поезда ў Райску. Выкочваецца з яго на мяккія ногі і заняголены пасажыр каля трыццаці-сарака. Хістаючыся кіруецца ў панішчаны чыгуначны будынак; калісь я быў пра яго стан крыху пісаў. Аднак пабачыў, што я прыглядаюся, завярнуўся, выйшаў і паплёўся ў бок Арэхавіч.

Зайшоў я ў станцыйны будынак. Калісь там стаяў тапчан; сёння асталася ад яго адно выгарэлая праекцыя яго ў падлозе і негарэлыя пружыны (на здымку). Гэта ў першым памяшканні, а ў другім — не буду пісаць, чым багата яго падлога. І той мой спадарожнік, відаць, хацеў там па сабе памятку пакінуць.

Эліты змагаюцца за чыгунку, кажуць — дзеля прэстыжу мясцовасці і выгады пасажыра. А пасажыр, бывае, лічыць чыгунку *wygódką* і, мякка кажучы, — *olewa*...

Аляксандр Вярбіцкі

Аберагайцеся махляроў і ашуканцаў

Сапсавалася мотапіла. Паехаў я на рынак, дзе гандляр-механік прыязджае. Калі я прад’явіў з чым прыходжу, чарнявы панок ахвотна ўзяўся за работу. Адвінціў дзве шрубы, пастукаў па глушыцелю і сказаў, што ўсё ў парадку. Паспрабаваў пусціць у ход пілу. Маўчала быццам зачараваная. Паліва з карбюратара не даходзіць, — заявіў майстар. З яго слоў я зразумеў, што калі б ён рамантаваў пілу, дык абышлося б мне ў найлепшым выпадку 50 зл., у найгоршым — 250 зл. Калі я хаваў пілу ў мяшок і збіраўся адыходзіць, панок заявіў: „Вы мне вінаваты 10 зл.”.

Едучы дамоў не мог я пагадзіцца з тым, што мяне абдурыў ашуканец. Нічога не зрабіў, а грошы ўзяў. Было гэта 5 красавіка. А 7 красавіка падаўся я з пілой у Беласток. У фірменнай майстэрні „Stihl” непадалёк аўтавакзала афармілі справу вокамгненна. Майстар не толькі зрабіў усё акуратна, але і перадаў некалькі практычных парадаў, як абыходзіцца з мотапіламі і дзе перахоўваць паліва. Здзелка абышлася за 35 зл.

Вось, даражэнькія, якія ў нас прыватныя гандляры. Адзін намагаецца шкуру злупіць з чалавека, а другі не толькі ветліва абслужыць, але і добрую параду дасць.

Праз тыдзень пайшоў я на рынак і папрасіў гандляра даць мне рахунак за рамонт пілы. Пачаткова прыкідваўся, што рахункі непрыдатныя, для адлічэння іх ад падаткаў. Моцна збянтэжыўся, калі я настойліва патрабаваў квітанцыю.

— Бярыце свае 10 зл. і лічыце, што справы не было, — заявіў ён пры сведках. Гэтай сцэнцы прыглядаліся многія чарамшане.

— Гэта добры махляр, — гаварыў Толік Верамчук з Вулькі- Тэрахоўскай. — Мяне хацеў абдурыць на некалькі дзесятак злотых, але я адмовіўся ад яго паслугі і рашыў сам з’ездзіць у Беласток. А Валодзю Самосюка, пенсіянера са Ставішчаў гэты ж майстар хацеў на сотню абдурыць. Гаварыў, што рамонт пілы будзе каштаваць каля 150 зл., а сябра пры мне заплаціў у беластоцкай майстэрні ўсяго 25 зл.

Мая парада такая: не давайце махлярам і прайдзісветам поваду для ашуканства. Пазбягайма здзелак на рынках і ў невядомых майстроў. Карыстаймася паслугамі праверaных майстэрняў. Пазбавімся гэтакім спосабам лішніх клопатаў і непатрэбных выдаткаў.

Уладзімір Сідарук

Ваду вары, вада будзе

Гмінная водная суполка „Тыневічы” з сядзібай у Нарве сваёй дзейнасцю ахоплівае ўсю тэрыторыю Нарваўскай гміны. Бюро знаходзіцца ў будынку Гміннай управы, па вуліцы Міцкевіча 101. Штатным працаўніком Воднай суполкі з’яўляецца спадар Асташэўскі, родам з Тыневіч, колішні працаўнік Воднага інспектарата ў Гайнаўцы; працаваў меліярантам, калі яшчэ існаваў Павятовы саюз водных суполак. Трэба тут падкрэсліць, што тады ў водных суполках былі штатныя работнікі і яны вельмі добра даглядалі меліярацыйныя равы і дрэнаж улетку.

Цяпер усё развалілася і водныя суполкі наймаюць сезонных работнікаў і плацяць ім грошы за канкрэтную работу, а часта і за тое, чаго яны не рабілі. Тут, каб не быць галаслоўным, прывяду прыклад з маёй вёскі Бялкі. Ва ўрочышчы „Града” на сенажацях у мінулым годзе рабочыя абкошвалі меліярацыйныя равы, але не дайшлі з абкошваннем да сенажацяў майго сына, гаспадаркі Грыгарукоў, Надлясніцтва Жэдня і на другім рове да сенажацяў Мікалая Раманюка; гэта канцоўкі равоў, якія і ў папярэднія гады мала калі даглядаліся. Усё гэта цяпер відна простым вокам. Належныя воднай суполцы грошы сяляне плацяць наперад у сакавіку і красавіку, а ачыстка равоў праходзіць летам і восенню.

Калі мой сын напісаў прашэнне ў Водную суполку ў Нарве, каб за 2003 год знялі яму складчыну 52,30 зл. тлумачачы, што ў мінулым годзе работнікі нічога не зрабілі на равах каля ягоных сенажацяў, дык атрымаў адказ, што калі да 30 красавіка 2003 года не заплаціць вышэйпамянёнай сумы, то яны справу накіруюць у казначэйскую палату і прыйдзе секвестратар сцягваць грошы. А вось аб тым, што ў мінулым годзе нічога на равах не рабілі, а грошы ўзялі, нічога не ўспамінаюць.

Ці ёсць якія-небудзь улады над воднымі суполкамі ў нашай дзяржаве, каб прыглядзеліся іхняй дзейнасці, і куды маглі б сяляне звяртацца за справядлівацю? Пытаўся я аб гэтым войта Нарваўскай гміны, але ён адказаў мне, што да воднай суполкі не мае аніякіх правоў і нічога не можа зрабіць.

Ці можа нашымі воднымі суполкамі павінен заняцца Міжнародны трыбунал? А можа стараста павета, або ваявода павінны гэтым заняцца як найхутчэй і зрабіць прыкладны парадак у Воднай суполцы „Тыневічы”, што ў Нарваўскай гміне.

Мікалай Лук’янюк

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп’ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk”, ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na III kwartał 2003 r. upływa 5 czerwca 2003 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch” na terenie całego kraju.

2. Cena prenumeraty na III kwartał 2003 r. wynosi 26,00 zł.

3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.

4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa”, Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

„Даўціпы” *Андрэя Гаўрылюка*

— Найдаражэйшая мая Галя, — прызнаецца малады хлопец, — ніхто мне, апрача цябе, на свеце не існуе.

— Я не Галя, толькі Таня.

* * *

Пытаюць Андрэя:

— Якая розніца паміж бландзінкай прыгожай і інтэлігентнай?

— Прыгожая падабаецца мне, а інтэлігентнай падабаюся я.

* * *

— Ведаю, што мяне кахаеш і ажэніцца са мною, але скажы, каго ты ўчора адвозіў на машыне.

— Э-э-э... Пятрова і Кузняцова!

— Тады скажы ім, што адзін з іх пакінуў на заднім сядзенні памаду.

* * *

Капрал загадаў збор сваёй каманды:

— Скажыце, ці птушкі патрабуюць грошай?

— Не-е!

— Дык добра, мае арлы, бо ўчора я прапіў ваша жалаванне.

Адгаданка

								1	2
3	4	5	6	7	8	9	10	11	12
13	14	15	16	17	18	19	20	21	22
23	24	25	26	27	28	29	30	31	32
33	34	35	36	37	38	39	40	41	42
43	44	45	46	47	48	49	50	51	52
53	54	55	56	57	58	59	60	61	62

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — афарызм.

1. акружэнне войскамі ўмацаванага пункта з мэтай яго захопу, аблога
= 57 __ 43 __ 17 __ 6 __ 9 __;
2. музыка, якая вырасла з новаарлеанскага негрыцянскага фальклору
= 18 __ 14 __ 15 __ 16 __;
3. не ноч
= 40 __ 41 __ 42 __ 55 __ 26 __;
4. будынак для жылля або для размяшчэння ўстаноў
= 58 __ 13 __ 12 __;
5. злакавая расліна для вырабу хлеба і спірту
= 61 __ 53 __ 38 __ 62 __;
6. муж дачкі
= 49 __ 35 __ 20 __ 21 __;
7. артэрыяльная і жыльная вадкасць
= 27 __ 47 __ 39 __ 36 __;
8. без дабра не бывае
= 25 __ 28 __ 54 __ 48 __;
9. снарад з выбуховым рэчывам, які хаваецца ў зямлю або пад ваду
= 51 __ 4 __ 5 __ 19 __;
10. сястра Веры і Любові
= 52 __ 1 __ 2 __ 3 __ 56 __ 44 __;
11. чыгуначная або трамвайная лінія
= 29 __ 50 __ 45 __ 46 __;
12. усходы азімых культур або загаловак першага літаратурнага зборніка „белавежцаў”
= 8 __ 7 __ 10 __ 11 __;
13. машына для апрацоўкі напр. металу або драўніны
= 22 __ 23 __ 60 __ 34 __ 24 __ 59 __;
14. верхняе адзенне для ніжняй часткі тулава і ног
= 37 __ 31 __ 32 __ 33 __ 30 __;

Ш

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 12 нумара

Ксенон, Ной, акт, гай, Аня, епіскап, біч, мост, кіно, кароль, удаў, комі.

Рашэнне: **Не паганяй коней бічом, толькі аўсом**.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лукашу Пацэвічу** з Беластока і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

А ну яе з тою Уніяй!

Вось я другі тыдзень без мае Агаты. Трэці ідзе. Свабода! Воля! Цішыня! Сум... Не, суму не даюць мне адчуваць Коля ды Збышка. Збышка Наскварка нікому не дае гэта адчуць, бо калі сум нахлыне нават на ўвесь горад, над усю краіну, над усю Еўропу... дык бярэцца наш сябра за свае шаманскія пенні, дзесьці ад Курпяў ці з-над Дняпра. Нават з каменя сок пацячэ, а што з чалавечых вачэй. А што, думаеце, слёзы адно ад жалю? І ад смеху, і ад захаплення ды чуласці. Дык са Збышкам або плакаць, або смяяцца. Усё адно, хоць нейкі занятак. А з Колем — ці колу вып'еш, ці малако, ці кілішачак сівушкі — у настрой трапіш. Калі смяяцца, дык ад вуха да вуха, калі цалавацца — з дубальтоўкі, калі рэзацца — дык да крыві! Шчырая славянская душа. А іншая душа такую душу чуе. Дык такіх трох, як мы ў славянскім трансе, рэдка знойдзеш. А я яшчэ і кінуты саламяны ўдавец... Гэта такая рэдкая птушка, якую трэба прытуліць ды суцешыць, з толкам, бо калі не, дык выпырхне ды паляціць у агонь нейкіх небяспечных жарсцяў. Дык добра ведала мая Агата, што або мяне ўпільнуюць, або, калі згрэшым, дык грэх на траіх, і пакаранне ад трох нашых анёлаў, жанок, значыць.

Ну, дык выбраўся я вечарком з Колем і Збышкам у кавярню. Тая кавярня больш піўбар, бо каву мала там хто п'е, думаю, з тае прычыны, што падаюць яе ў такіх малюпасенькіх кубачках. Глытнеш раз добра. Дык хто будзе пасля сядзець над пустым кубачкам, тым больш, што афіцыянткі хутка яго забіраюць. Дык і мы ўзялі па піўцу.

Я ўжо і нават прытварацца, што п'ю тое піва, не змог. Бо як жа будзеш займацца півапіццём, калі вочы разбягаюцца?! Або размову весці пра Еўрасаюз? Гэта яны, маладыя прыгожыя паненкі ды плячыстыя хлопцы, пра ЕС, так сказаць, гамоняць. Спрачаюцца так, што аж сыплюцца іскры. Урэшце і на нас час прыйшоў, як на экспанаты прамінулае эпохі.

— Ну, глянь ты на гэтых старэчаў, — паказаў на нас пальцам адзін маладзён у майцы з белым арлом з зоркай у лапе. — Гэта прыклад адсталасці і нееўрапейскасці. Пойдуць у рэферэндуме галасаваць на „не”.

— Не такія яны і старыя, — паглядзела на нас як на паддоследныя прэпараты брунетка ў акулярах. — Мабыць, і яны за прагрэс.

— Ты што ты, той сівы ў блакітнай кашулі, чыстай вады вапняк, пэўна, былы партыец... — агледзеў мяне ад галавы да пят кавалер пад гальштукам.

— Іхная партыя цяпер за Еўрасаюз, — тлумачыла тыповая бландзінка.

— А, можа, мяне запыталі б вы, я за ці супраць? — прарыпеў я несваім, ухваляваным голасам.

— Аддайце свой голас на „не”! — кінуўся да нашага століка ад трэцяга дзядзька ў акулярах, падобны да аднаго беластоцкага дэпутата. Дэпутат пры гэтым перакуліў свой келіх з белым віном.

— Так, так! — я не вельмі зразумеў, ці ад чацвёртага століка агітуюць за сказаным раней, ці супраць.

— Не! Не! — з галерэі за зашклёнай сцяной кавярні выбегла мажная кабеціна ў цёмна-сіняй сукенцы ды з акуратнай завіўкай на галаве.

Усе ўставіліся на нас.

— Мы, вось, калектыўна вырашылі так, — пачаў я пасля хвіліны маўчання ды нарады за нашым сталом. — Я галасую „так”, пан Мікола „не”, каб было справядліва, а пан Збігнеў не пайшоў на рэферэндум.

Мы з пачуццём выпаўненага абавязку ўзяліся за сваё піўцо.

Вандал Арлянскі

Час думаць пра плён

У лесе мінула ўжо зіма і надыходзіў час загатоўкі будучых плёнаў.

— Каб сабраць на чарговую зіму, трэба ўжо цяпер думаць, што збіраць будзем, — пачаў на паляне чарговы сход уселяснога кіраўніцтва мядзведзь Сандар Жоржавіч. Сёння ўдзел прыняла ў ім звярына — вядучая сіла ўзлескаў.

— Ну, як гэта сабе ўяўляеце? Ну, можа, першы хай будзе заяц з Бродна. Як там будзе ў вас у Броднінскім ўзлеску?

Заяц апусціў вушы, перахіліў галоўку, прысеў на задніх скоках, а пярэднія бязрадна развёў.

— Ы-ы-ы, — прабалбатаў.

— Хочаце сказаць, што ў Броднінскім узлеску ў цяжкую будучую зіму будзеце карміцца гэтым „ы-ы-ы”? Такім „ы-ы-ы” не наясіся! — не хаваў злосці мядзведзь. — Ну, а ў Берасцянскім узлеску вядома, як будзе.

Курапатка — вядучая сіла Берасцянскага ўзлеску затрапятала сваімі падфарбаванымі пёркамі.

— З самога трапятання ды трапання ежы не будзе. Той хто трэпле, той не есць! — цярплівасць Сандара Жоржавіча канчалася.

Тым часам уселясное кіраўніцтва, адчуваючы мядзведжую злосць, схавалася ў цяні вядучых сілаў узлескаў.

— Лепш не выхінацца. Яшчэ так не было, каб зімою ў пысу нічога не трапіла, — падумала лань Гаўрусіха, укладваючыся пад дрэвам за бродненскім зайцам, які ўсё стаяў на задніх лапах.

— Вы там, лань, не хавайцеся. Я ўсё бачу, — зларадна глянуў у яе бок мядзведзь. — Калі не выдумаеце, што збіраць, будзеце жэрці саміх сябе.

Гаўрусіха скаланулася, падкурчыўшы тонкія ножкі. Уявіла сябе лясную іклaстую звярыну, як дабіраецца да яе роду.

— Ну, добра. Ідзіце і думайце, што трэба будзе нам збіраць, — расслабіўся Жоржавіч.

Так кончыўся сход. Ніхто на паляне не заўважыў, як да ўсяго з-за кустоў прыслухоўваліся змяя Ссапія і вуж Ззянон.

— Можа, самі сябе ўрэшце даканаюць, — радасна прасіпела Ссапія вужу.

— Сама ідэя іх не пракорміць! — падтрымаў яе Ззянон. — Бярэмся, Ссапійка, за працу.

Змяя і вуж папаўзлі ў глыб лесу. Пачалі абшукваць тэрыторыі, дзе мог бы знайсціся будучы запас. Гэтым часам над лесам стаў уздымацца нейкі дзіўны пошум. З узлескаў неслася інтэнсіўнае хваляванне думак вядучых сіл.

МакХолад

ISSN 0546-1960